Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варачаюцца.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:	
На 1 месяц	70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	7 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя—20 к.	
мясцовыя	—10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:	
За радок нанпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нанпарэлі пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.	
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.	

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:	
За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „
Публікацыі ЗАГС'—3 руб.	

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-мы ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 242 (2134) Нядзеля, 23-га кастрычніка 1927 г.

Замежны пралетарыят—з намі.

У працягу вось ужо некалькіх гадоў наш Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік наведваюць розныя чужаземныя рабочыя дэлегацыі. Да дзесятых угодкаў Вялікай Кастрычнікавай рэвалюцыі мы таксама чакаем шмат рабочых дэлегацый з розных краін.

Што прымушае рабочых прыяжджаць да нас? Што прымушае рабочых СССР аказваць шырокую гасьцінасьць замежным рабочым?

Кожны ведае, што наша рэвалюцыя была і застаецца сусьветнай пралетарскай рэвалюцыяй. Кожны ведае, што, калі 10 год таму назад рабочая кляса і сялянства ўзьняліся супроць улады капіталістаў, для іх зьнішчэньне панаваньня абшарнікаў і капіталістаў у нашай краіне было толькі часткай вялікай, агульнай для рабочых усіх краін задачы—барацьбы з панаваньнем капіталу ва ўсім сьвеце.

Наведваньне СССР чужаземнымі рабочымі дэлегацыямі мае вялізнае значэньне іменна таму, што самі рабочыя тут навочна пераконваюцца ў поўнай неадпаведнасьці плёткаў капіталістаў з сапраўдным становішчам у нашай краіне.

Узяць хоць-бы першую дэлегацыю, якая наведала СССР у лістападзе-сьнежні 1924 году—дэлегацыю ангельскага генэральнага савету прафэсыянальных саюзаў. Дэлегацыя гэта складалася з людзей, якія здаўна мелі рэпутацыю ворагаў рэвалюцыйнай клясавай барацьбы. Але калі гэтыя людзі пазнаёміліся з тым, што робіцца ў нас, дык нават яны прымушаны былі прызнаць, што ў СССР праводзіцца ўпартая і энэргічная праца па будаўніцтву сацыялізму.

Адна гэта дэлегацыя шмат зрабіла для азнаямленьня замежных рабочых з сапраўдным становішчам справы ў СССР, для зьнішчэньня таго няверʼя рабочых у свае сілы, якое старанна навязвалі ім капіталісты і якое служыла адным з сродкаў узмацненьня панаваньня буржуазеі. Другая дэлегацыя, якая прыяжджала ў СССР улетку 1925 году і складалася з нямецкіх сацыял-дэмакратычных і беспартыйных рабочых, наведала нашу краіну іменна таму, што нямецкія рабочыя, якія пазнаёміліся праз справаздачу ангельскай дэлегацыі з працай і будаўніцтвам у СССР, захацелі праз сваіх выбарных праверыць весткі гэтай дэлегацыі.

Пасьля ангельскай і нямецкай дэлегацый СССР наведалі дэлегацыі нарвэская, швэдзкая, франка-бэльгійская, аўстрыйская, фінская, другая нямецкая дэлегацыя і шэраг іншых. Кожная з іх уносіла сваю частку для ўзмацненьня сувязі паміж рабочай клясай і сялянствам СССР і рабочымі масамі капіталістычных краін. Кожная з іх уносіла сваю частку для ўзмацненьня веры ў творчыя сілы рабочай клясы ў самых шырокіх рабочых масах.

Прыезд да нас на ўрачыстае сьвяткаваньне дзесятай гадавіны вялікай рэвалюцыі звыш 500 дэлегатаў рабочых з Нямеччыны, Англіі, Францыі, Аўстрыі, Нарвэгіі, Швэдыі, Фінляндыі і цэлага шэрагу іншых краін—паказвае, што імкненьне да ўстанаўленьня сувязі з савецкай краінай захапляе зараз вялізныя масы рабочых. Усюды дэлегаты выбіраюцца на шырокіх рабочых сходах. Усюды пры выбарах гэтых дэлегатаў рабочыя, падаючы свае галасы, абяцаюць падтрымліваць рабочых і сялян СССР у іх будаўніцтве і ў іх барацьбе з капіталістамі ўсяго сьвету.

Што-ж, такім чынам, пабуджае чужаземных рабочых прыяжджаць да нас? Яны едуць сюды, каб пераканацца ў магчымасьці будаваць прамысловасьць і сельскую гаспадарку без абшарніка і капіталіста. Яны прыяжджаюць сюды для таго, каб на ўласныя вочы перакапацца ў посьпехах нашага будаўніцтва. Яны прыяжджаюць сюды для таго, каб наладзіць шчыльную братэрскую сувязь з рабочымі і сялянамі СССР і супольна з імі ўтварыць адзіны фронт супроць капіталу ва ўсім сьвеце.

Кожны прыезд чужаземнай рабочай дэлегацыі азначае адыход шырокіх рабочых мас з-пад уплыву сацыял-згоднікаў і рэфармістаў. Кожны прыезд чужаземнай рабочай дэлегацыі азначае пераход на пазіцыі клясавай барацьбы з капіталам усё новых і новых мас рабочых за нашым чырвоным рублём. А гэта—парука перамогі рабочай клясы над буржуазеяй усяго сьвету, парука магчымасьці для вас закончыць начатую дзесяць год таму назад справу без перашкод, без ваеннага ўмяшацельства з боку капіталістычных краін, без пагрозы, што ўсе нашы дасягненьні загінуць у пажары новай сусьветнай вайны, якая рыхтуецца буржуазеяй.

Працэс Шварцбарда абярнуўся ў суд над пятлюраўшчынаю.

МАТАРʼЯЛЫ АБАРОНЫ ЎВАЧАВІДКІ ДАВОДЗЯЦЬ АБ ПАГРОМНАЙ ЧЫННАСЬЦІ ПЯТЛЮРЫ.—У ЗАЛІ СУДУ СЬВІСТ І АБУРЭНЬНЕ ПРОЦІ ПЯТЛЮРАЎЦАЎ.

ПАРЫЖ, 21-Х. 4-ы дзень працэсу Шварцбарда распачаўся з паказаньняў сьведкі абвінавачаньня Шульгіна (украінскі рэакцыянэр, з аднолькавым прозьвішчам з манархістам Шульгіным).

Шульгін пачынае свае паказаньні з заяўленьня, што Шварцбард учыніў забойства «па загаду з Масквы». Водлуг слоў Шульгіна, справа не ў яўрэйскіх пагромах на Ўкраіне, а ў разгроме ўсёй Украіны бальшавікамі. Шульгін заяўляе, што Шварцбарда памылкова лічаць ідэалістам-абаронцай яўрэяў. Гэта, паводле слоў Шульгіна, недарэчнасьць, бо ён проста агент ЧК.

Абаронца **Торэс** патрабуе, каб былі дадзены доказы таго, што Шварцбард нібы зьяўляецца бальшавіком.

Шульгін: «У мяне няма доказаў, але я цьвёрда ў гэтым пераконаны».

Цывільны пазывальнік **Кампіншы** агалашае лісты з рэкамэндацыяй генэралаў Табуі і Фэндэрба, выдадзеныя імі Шульгіну. У гэтых лістох заяўляецца, што Пятлюра быў прыяцель Францыі. Табуі піша ў сваім лісьце: «Калі Пятлюра вымушан быў пакінуць Украіну, дык я перажыў крах усіх маіх надзей». Кампіншы дадае, што Шульгін паехаў у Баўгарыю з намерам угаварыць цара Фэрдынанда парваць з Нямеччынай і перайсьці на бок Францыі.

Торэс агалашае лісты Пятлюры да аўстрыйскага і нямецкага ўрадаў. У гэтых лістох спатыкаюцца выразы як «прыяцельская нацыя», «хвала Нямеччыне» і інш. Лісты робяць у залі вялікае ўражаньне.

Шульгін: «Я ня ведаю гэтых лістоў. Бываюць абставіны, калі прыходзіцца пісаць проці жаданьня».

Сьведка абвінавачаньня Ўдавічэнка паказвае, што Пятлюра быў прыяцелем яўрэяў і заўсёды змагаўся з пагромамі.

Торэс агалашае дакумант, з якога відаць, што дывізія Ўдавічэнкі забіла 100 яўрэяў у Шаргарадзе, у прысутнасьці сваякоў, прычым перад забойствам салдаты ўжывалі страшэнныя катаваньні, напр.: у ахвяр вырывалі языкі, выколвалі вочы і інш.

Удавічэнка адмаўляе гэта і заяўляе, што на Шаргарад наступалі чырвоныя і пятлюраўцы. Забітыя былі ахвярамі перастрэлкі, а не пагрому.

Торэс: «Злавіў сьведку на месцы злачынства. Ён пераблытвае факты, пацьверджаныя афіцыйнымі дакумантамі». Торэс агалашае рапарт ураду пятлюраўскага начальніка Валынскае акругі, які паведамляў падрабязнасьці пагромаў, учыненых дывізіяй Удавічэнкі. У залі страшэнны шум і сьвіст.

На неаднолькавыя запытаньні Торэса, ці стаяў Пятлюра на чале украінскай арміі ў часе пагромаў, Удавічэнка ўхіляецца ад адказу, называючы імені Тутувьніка і Асецкага ў якасьці праваднроў арміі.

Сьведка абвінавачаньня **Шуміцкі** таксама падцьвярджае «любоў Пятлюры да яўрэяў». Шуміцкі далей заяўляе: «Пасьля забойства Пятлюры за намі ходзяць падазроныя асобы, плююць нам у твар, здаволены забойствам нашага правадыра».

Торэс агалашае тэлеграму, атрыманую з Амэрыкі ад Рэвуцкага з просьбай заявіць суду, што Пятлюра нясе адказнасьць за пагром. Рэвуцкі паведамляе, што ўласна на гэтай прычыне ён у свой час падаўся ў адстаўку. Торэс агалашае таксама ліст Краснога, які піша: «Самы крывавы пагромшчык — Пятлюра — аднавіў страшныя часы сваіх продкаў гайдамакаў». Канчаючы зачытаньне ліста, Торэс заўважыў: «Я не пераблытваю ніколі лістоў і дакумантаў», намякаючы гэтым на тое, што Кампіншы, агалашаючы ўчора адзін афіцыйны дакумант, прачытаў толькі пачатак, выгодны для абвінавачаньня і ня чытаў канца, які адхіляў пачатак.

Кампіншы, хвалюючыся, патрабуе растлумачэньня наконт гэтага намёку.

Торэс апавядае, у чым справа.

Кампіншы ў адказ спрабуе апраўдацца завярэньнем, што нібы ён ня ведаў зьместу гэтага дакуманту да канца. Пры гэтым Кампіншы заяўляе, што «ніжэй Вашага гонару сацыялістычнага абаронцы абурацца тым, што Пятлюра ня меў вайсковых судоў, хоць-бы нават для пакараньня пагромшчыкаў».

Торэс адказвае: «Калі ўжо гаварыць аб палітычных пераконаньнях, дык ня толькі я адзін ведаю Ваш жыцьцяпіс».

На гэтым пасяджэньне зачыняецца пры страшэнным шуме.

Гав. Даўгалеўскі—новы пасол СССР у Францыі.

Даўгалеўскі Валер Саўлаў нарадзіўся ў 1885 годзе ў Кіеўскай губ. У 1903 годзе начаў працаваць у марксыцкіх гуртках. У канцы 1905 году перайшоў на нелегальнае становішча, працуючы ў якасьці прафэсыянала-рэвалюцыянэра. У 1907 годзе быў прысуджан кіеўскай судовай палатай да высылкі на ўсё жыцьцё. Вясною 1908 году ўцёк заграніцу. Увосень таго-ж году ў Льежы (Бэльгія) увайшоў у бальшавіцкую партыю. Увесь час пабыту заграніцаю працаваў актыўна ў партыі. У 1913 годзе атрымаў у Тулузе (Францыя) дыплём інжэнэра-электрыка, але распачаў сваю прафэсыянальную карʼеру ў якасьці рабочага.

У 1917 годзе вярнуўся ў Расею. 1918-1919 гады правёў у Чырвонай арміі. У 1920 годзе быў назначан членам камісіі Савету Працы і Абароны па аднаўленьні чыгунак Сібіры і Ўралу і камісарам кіраўніцтва сувязі і электра-тэхнікі ПК Шляхоў. Вясною 1921 году быў назначан наркомам Пошт і Тэлеграфу РСФСР, а пасьля намесьнікам наркома Пошт і Тэлеграфу СССР і адначасна рэктарам Маскоўскага інстытуту цывільных інжэнэраў.

Восеньню 1924 году быў назначан паўнамоцным прадстаўніком СССР у Японіі, на якой пасадзе і знаходзіўся да новага назначэньня.

Судовая справа ад 1907 г. аб т. Даўгалеўскім.

КІЕЎ, 22-Х. У гістарычна-рэвалюцыйным архіве Кіева захаваўся арыгінал справы кіеўскае судовае палаты ад 1907 г. за № 390 аб сучасным паўнамоцным прадстаўніку СССР у Францыі т. Даўгалеўскім.

Як відаць са справы, у лістападзе 1905 г. Доўгалеўскі выступаў на шматлюдным сходзе сялян у сяле Палішаеўцы, Васількоўскага раёну, прысьвечаным пытаньню аб пасылцы дэлегатаў на ўсерасейскі зьезд сялянскага саюзу, быў пасьля аддадзен пад суд судовае палаты, абвінавачан у агітацыі за скасаваньне існуючага ладу і засуджан да высылкі.

Бесядоўскі—часова паверраны ў справах СССР у Парыжы.

МАСКВА. У нядзелю 23-га кастрычніка ў Парыж выяжджае тав. Г. З. Бесядоўскі, назначаны дарадчыкам паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Францыі.

Бесядоўскі да прыезду ў Парыж нованазначанага паўнамоцнага прадстаўніка т. Даўгалеўскага будзе выконваць абавязкі часовага паверанага ў справах.

Напярэдадні ратыфікацыі савецка-латвійскае згоды.

Абгавор згоды ў латвійскім сойме.

РЫГА, 21-Х. Сёньня ў 10 гадз. увечары ў латвійскім сойме распачалося абмеркаваньне савецка-латвійскага ўгавору, якое ня спынялася ў працягу 11 гадзін. Далейшы праця г спрэчак назначан на аўторак.

Ворагі ўгавору не здаюцца.

РЫГА, 22-Х. Учора на вячэрнім пасяджэньні сойму, апазіцыя, імкнучыся адцягнуць абмеркаваньне савецка-латвійскага гандлёвага ўгавору, падала ў сойм запытаньне аб непрадукцыйным выдаткаваньні дзяржаўнага насеннага фонду. Адказ ураду на гэтае запытаньне будзе дадзен у пятніцу.

Пасьля таго, як сойм аднагалосна прызнаў інтэрпэляцыю нясьпешнаю, апазіцыя, спасылаючыся на позьні час, спрабавала адкласьці абмеркаваньне савецка-латвійскага гандлёвага ўгавору. Аднак сойм большасьцю галасоў пастанавіў распачаць абмеркаваньне ўгавору. З дакладам аб угаворы выступіў Білманіс.

Пасьля дакладу пастаноўлена далейшае абмеркаваньне ўгавору адкласьці на 25-ае кастрычніка.

Крывавыя расправы над рэвалюцыянэрамі ў Кітаі.

Нанкін ліквідуе канфлікт.

ШАНХАЙ, 21-Х. Нанкінскі надзвычайны камітэт Гаміндану згадзіўся на патрабаваньне Ван-Цьзін-Вэя аб скліку пленуму ЦК і ЦКК Гаміндану і пастанавіў скліканць пленум 1-га лістапада.

РАСТРЭЛЫ КАМУНІСТАЎ.

ШАНХАЙ, 21-Х. Водлуг паведамленьняў кітайскіх газэт, у Ханьхоу растрэлен камуніст Ся-Цьзе, кіруючы адным з сялянскіх атрадаў у Хубэі.

Кітайскія газэты паведамляюць, што ў Сіаме арыштаваны Лю-Туншан, адзін з камуністаў, уцёкшых у Сіам з паўднёвых прывінцый і кіруючых адтуль прапагандаю. Арыштаваны быў перададзен кітайскай уладзе.

Барацьба за ўладу ў Кантоне.

ШАНХАЙ, 21-Х. З Ганконгу паведамляюць, што ў Кантоне заснавана вайсковая рада правінцыі Гуандунь і Гуансі. Рада складзена з прыхільнікаў Чан-Фа Гуя. Лі-Ці-Сін у яе склад не ўвайшоў.

2 ангельскія пазыкі Чжан-Цзо-Ліну.

ШАНХАЙ, 21-Х. Водлуг вестак нанкінскага агенцтва Гомінь, якое спасылаецца на мукдэнскія газэты, Чжан-Цзо-Лін атрымаў ад ангельскіх фірм дзьве пазыкі. Адна пазыка—у 20 міліёнаў даляраў—атрымана ад фірмы, якой за гэта дазволена пабудаваць чыгунку ў правінцыі Чжылі з Цзянчжоу ў Шыцьзячуан. Другая пазыка—на суму 10 міліёнаў даляраў—названа прамысловай пазыкай Поўначы і Калгану.

Японская правакацыя ў Сватоу.

ШАНХАЙ, 21-Х. У часе барацьбы гуандуньскага ўрадавага войска з арміяй Іе-Ціна, японская кананэрка затрымала гуандуньскае вайсковае судно, зьняла з яго кітайскі сьцяг і вывесіла японскі.

Упаўнаважаны па замежных справах у Сватоу затрабаваў ад японскага консула папрасіць прабачэньня, звальненьня камандзіра кананэркі і звароту вывезеных з кітайскага судна гармат. Японскі консул адмовіўся задаволіць патрабаваньні, спасылаючыся на тое, што ён (консул) толькі нядаўна назначан у Сватоу і нічога ня ведае аб інцыдэнце.

У зьвязку з гэтым у Сватоу ўчора адбываліся вялікія дэманстрацыі проці японцаў. Дэманстранты вымагалі абвяшчэньня байкоту Японіі. Японская ўлада ў Сватоу, занепакоеная дэманстрацыяй, патрабавала ад японскага ўраду неадкладнае прысылкі японскае кананэркі „для абароны японскіх грамадзян“.

Крэдыты СССР у Вене.

ВЕНА, 22-Х. Венскі муніцыпалітэт пастанавіў узяць на сябе гарантаваньне дадатковага вывазу ў СССР з Венскае правінцыі ў разьмеры 70 проц. ад сумы заказаў і ня звыш 100 міліёнаў залатых шылінгаў.

Апазіцыя ўстрымалася ад галасаваньня.

Паход на францускую кампартыю.

ПАРЫЖ, 21-Х. Проці рэдактара «Юманітэ» Гея, супрацоўніка тае-ж газэты Сэн-Прэ і рэдактара газэты „Об Сосіяль“ Мішле распачата судовае сьледзтва па абвінавачаньні ў „падбухторстве вайсковаслужачых да непаслухмянасьці“ і за артыкулы аб ваенных апэрацыях у Марока.

У Туры, Рэймсі, Грэноблі і Ліможы зроблены вобыскі ў памяшканьнях кампартыі і ў кватэрах актыўных членаў партыі.

Весткі адусюль.

Падтрыманьне Польшчы Францыяй.

ПАРЫЖ, 21-Х. Абмяркоўваючы польска-літоўскі канфлікт, увесь францускі друк выказваецца ў карысьць Польшчы.

Савецкі лес у Амэрыцы.

НЬЮ-ЁРК, 19-Х. З Архангельску ў Нью-Ёрк прыбыў першы вялікі транспарт савецкага лесу ў 2 з пал. міліёны куб. футаў.

Палёт Парыж—Масква.

ПАРЫЖ, 21-Х. Лётчык Кніпінг на борце самалёту „Лежэ“ вылецеў у 23 гадз. 14 хв. у напрамку на Маскву з намерам устанавіць новы сусьветны рэкорд на далёкую адлегласьць па простай лініі.

АПОШНІЯ ВЕСТКІ.

(Атрыманы а 1 гадзіне ўночы).

АНГЕЛЬЦЫ СКАСАВАЛІ ЗГОДУ АБ КІТАЙСКІМ КІРАЎНІЦТВЕ АНГЕЛЬСКАЙ КАНЦЭСІЯЙ У ХАНЬКОУ.

ШАНХАЙ, 22-Х. Ангельскі консул у Ханькоу зьвярнуўся да камісара па чужаземных справах з нотай, якая фактычна парывае над ўнюю згоду аб пераходзе былой ангельскай канцэсіі ў Ханькоу пад кітайскае кіраўніцтва. У ноце гаворыцца, што да стварэньня адказнага ўраду, з якім можна было-б весьці перамаўленьні, консул ня будзе прызнаваць назначанага кітайскімі ўладамі новага старшыню кіраўніцтва тэрыторыяй былой канцэсіі. Абавязкі старшыні будуць перададзены муніцыпальнаму савету. Камісар па чужаземных справах у Ханькоу адказаў, што гэта выкліча абурэньне кітайскага народу і што ангельскі ўрад павінен перагледзець сваю палітыку ў Кітаі, каб ухіліцца непаразуменьняў.

Ніводная з ангельскіх шанхайскіх газэт не надрукавала ні ноты ангельскага консула, ні адказнай ноты камісара па чужаземных справах.

ФРАНЦУСКАЯ РАБОЧАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ—У МАСКВЕ.

МАСКВА, 22-Х. Прыехала першая француская рабочая дэлегацыя ў складзе 35 чалавек. Дэлегацыю спаткалі шматлікія прадстаўнікі маскоўскіх фабрык, заводаў, прафсаюзаў і вучнёўскай моладзі. Ля вакзалу адбыўся мітынг. Адказваючы на прывітаньні прадстаўнікоў УЦСПС і МГСПС, старшыня дэлегацыі сацыяліст Ганон сказаў: «Сярод членаў дэлегацыі ёсьць сацыялісты, камуністы, анархісты, але ўсіх нас яднае адно пачуцьцё радасьці перад гераізмам рабочае клясы СССР. У час, калі ваенная небясьпека стане для СССР рэальнай пагрозай, францускі пралетарыят знойдзе досыць сьмеласьці, каб крыкнуць на ўвесь сьвет: «Рукі прэч ад СССР».

НОВЫЯ ПАДЗЕМНЫЯ ШТУРШКІ Ў КРЫМЕ.

СІМФЭРОПАЛЬ, 22-Х. У Ялце 20 кастрычніка адчуваліся тры слабыя падземныя штуршкі. У Алушце адзначаны штуршкі ўночы з 21 на 22 кастрычніка і досьвіткам 22 кастрычніка. Штуршкі адчуваліся таксама ў Гурзуфе досьвіткам і днём 21 кастрычніка. Жыхарства паўднёвага берагу ўжо звыклася з штуршкамі. У Ялту варочаецца шмат уцекачоў.

КАСТРЫЧНІКАВАЯ ПЕРАКЛІЧКА.

РАБОЧЫЯ ДЭЛЕГАЦЫІ З НОВАГА СЬВЕТУ.

НЬЮ-ЁРК, 21-Х. Сёньня выяжджае ў СССР 26 прадстаўнікоў розных прафсаюзаў Злучаных Штатаў для ўдзелу ў сьвяткаваньні дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі. Выяжджаючыя не зьяўляюцца афіцыйнымі прадстаўнікамі прафсаюзаў, але шмат-хто з іх дэлегаваны ад мясцовых прафсаюзных арганізацый.

* * *

НЬЮ-ЁРК, 21-Х. Сёньня з Нью-Ёрку выехала ў СССР мэксыканская рабочая дэлегацыя.

* * *

НЬЮ-ЁРК, 21-Х. Прафсаюзнае абʼяднаньне Аргентыны паслала ў СССР дэлегацыю ў складзе 7-мі асоб для ўдзелу ў сьвяткаваньні 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі.

Фэдэрацыя працы Буэнос-Айрэсу, у якой абʼяднана 40 прафсаюзных арганізацый, паслала асобна двух дэлегатаў.

З АНГЛІІ ВЫЯЖДЖАЕ 51 ЧАЛАВЕК.

ЛЁНДАН, 21-Х. Нацыянальны камітэт па арганізацыі кастрычнікавае дэлегацыі ў СССР канчаткова зацьвердзіў склад дэлегатаў у ліку 51 чалавека па сьпісу кандыдатаў, абраных на раённых канфэрэнцыях.

ДРУГАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ З ФРАНЦЫІ.

ПАРЫЖ, 21-Х. Выезд другой часткі францускае рабочае дэлегацыі ў СССР для ўдзелу ў сьвяткаваньні дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі прадугледжваецца 25-га кастрычніка. У склад дэлегацыі ўваходзяць 40 рабочых, абраных на сходах, наладжаных на прадпрыемствах.

НА ПРАЦЭСЕ ВЭНГЕРСКІХ КАМУНІСТАЎ.

Абвінавачаныя трымаюць сябе з гонарам.—Рэпрэсіі суда проці падсудных. Суд бароніць прэстыж сацыял-здраднікаў

Прадстаўнік Лігі правоў чалавека на працэсе.

ВЭНА, 21-Х. На вячэрнім пасяджэньні суду па справе Санто і таварышоў было запытана 12 абвінавачваемых. Усе яны адмовіліся ад сваіх ранейшых паказаньняў на папярэднім сьледзтве, якія былі вымушаны ў іх прымусова страшэннымі катаваньнямі.

Абвінавачваемы НОРМАН заявіў, што ён член сацыял-дэмакратычнае партыі, але спачувае камуністам. Ён быў пазбаўлен слова пасьля таго, як зазначыў, што сацыял-дэмакраты таксама эксплёатуюць прафсаюзы, як буржуазея разуменьне бацькаўшчыны. За парлямэнцкія мандаты яны выдалі ўраду на расправу некалькі прафсаюзаў.

Абвінавачаны КІСО, па прафэсіі настаўнік, прызнаў, што ён камуніст і заявіў, што так званая дэмакратыя—замаскаваная дыктатура буржуазеі, а ў некаторых краёх буржуазея ажыцьцяўляе сваю дыктатуру адкрыта. На запытаньне старшынствуючага, чаму Кісо на папярэднім сьледзтве паказаў, што камуністы абернуць будучую вайну ў грамадзянскую вайну, Кісо адказаў: „Я пераканаыны, што грамадзянская вайна скароціць пакуты чалавецтва“. За гэтую заяву Кісо быў паўторна заклікан да парадку, пазбаўлен слова і пакараны зьняволеньнем у цёмную камору.

Абвінавачваемы БОЭР заявіў, што ён камуніст, але нажаль не член партыі. Старшынствуючы запытаў Боэра, чаму ён аб гэтым шкадуе. Боэр адказаў: „Таму, што месца кожнага клясава-сьвядомага рабочага—ў шэрагах камуністычнае партыі. Я, на жаль, яшчэ не знайшоў шляху ў яе шэрагі. Вэнгерская буржуазея забараняе творы Маркса, а твораў Леніна і камуністычнае літаратуры баіцца больш, чымся халеры. Старшынствуючы пазбавіў Боэра слова і ў дысцыплінарным парадку засудзіў яго да зьняволеньня ў працягу сутак у цёмнай каморы. Боэр іранічна падзякаваў і атрымаў за гэта яшчэ трое сутак. Ён другі раз падзякаваў і атрымаў за гэта яшчэ трое сутак з пераводам на хлеб, ваду і цьвёрдае ложка. Потым старшынствуючы агаласіў некалькі асобных сказаў з пратаколу паказаньняў Боэра на папярэднім сьледзтве, так што стварылася ўражаньне, нібы Боэр прызнаў, што ён вёў агітацыю сярод вартаўнікоў. Боэр заявіў пратэст проці самавольнага агалашэньня асобных мест яго паказаньняў, бо гэта пераблытвае іх сэнс.

Старшынствуючы; «Я лепш за вас ведаю мае абавязкі і чытаю, як мне захочацца». БОЭР: „Гэта ня так. Я маю права распараджацца маімі паказаньнямі і патрабую, каб пратакол допыту быў агалошан поўнасьцю“. За гэтую заяву старшынствуючы ізноў пазбавіў Боэра слова і дадаў яму яшчэ трое сутак цёмнае каморы.

Між абвінавачаным парабкам Тысо, членам сацыялістычнае рабочае партыі і старшынствуючым адбыўся наступны дыялёг: СТАРШЫНСТВУЮЧЫ: „Што такое ленінізм“. ТЫСО: „Дармовая перадача зямлі сялянству і дыктатура рабочае клясы проці буржуазеі“. СТАРШЫНСТВУЮЧЫ: „Што такое сацыял-дэмакратызм“. ТЫСО: „Буржуазная партыя“. СТАРШЫНСТВУЮЧЫ: „Што такое дэмакратыя“. ТЫСО: «Ашуканства народу». СТАРШЫНСТВУЮЧЫ заклікае Тысо да парадку і пазбаўляе яго слова.

Перад зачыненьнем пасяджэньня ўсе абаронцы затрабавалі, каб паказаньні абвінавачаных аб гвалтах, якія проці іх ужыла паліцыя, былі зьмешчаны ў пратаколе, і каб вінаватыя былі прыцягнуты да адказнасьці. Абмеркаваньне гэтага патрабаваньня суд адклаў.

У Будапэшт па даручэньню Лігі Правоў чалавека прыехаў член парыскага муніцыпалітэту Бос. Ён будзе прысутнічаць на працэсе і зьбярэ весткі аб гвалтах, якія ўжывалі проці абвінавачаных на папярэднім сьледзтве.

Кэблеш вызвален.

ПРАГА, 21-Х. Кэблеш вызвален і выехаў з Бярэзгача ў Прагу.

Няўдачны манэўр сігуранцы.

ВЕНА, 21-Х. У палітычных колах падкрэсьліваюць, што вымушаная адмова румынскага ўраду ад патрабаваньня ў выдачы Кэблеша тлумачыцца тым, што румынскі ўрад ня мог пацьвердзіць высунутага Кэблешу абвінавачаньня ў падробцы чэкаў хоцьбы самымі нязначнымі данымі. Ён баяўся, што адсутнасьць якіх-небудзь доказаў і шырокая кампанія пратэсту, узьнятая камуністамі, прымусіць чэхаслаўацкі ўрад адмовіцца ад выдачы Кэблеша, што было-б зьнявагаю міжнароднага гонару Румыніі.

Стачачны рух у Польшчы.

Забастоўкі ў Горнай Сілезіі.

На некаторых капальнях Горнай Сілезіі ўзьніклі забастоўкі ў знак пратэсту проці дзейнасьці дырэкцыяў гэтых капальняў.

Забастоўка на сярніковай фабрыцы.

Забаставалі работнікі сярніковай фабрыкі ў Чэхавіцах, выставіўшы дамаганьні падвышкі платы.

Забастоўка ў фірме «Фонто».

У фірме „Фонто“ ў Барыславе забаставала каля 800 работнікаў, якія дамагаюцца палепшаньня быту. Забастоўка праходзіць спакойна.

Гандлёвы баланс Польшчы ў верасьні.

Гандлёвы баланс Польшчы ў верасьні г. г. выявіўся ў наступным: прывезена тавараў на суму 218.598.000 злотых, а вывезена на 205.195.000 злотых.

Сэсія Інтэрнацыяналу гарнякоў у Варшаве.

Ангельская дэлегацыя ня прыехала.

ВАРШАВА, 22-Х. Пленум міжнароднае фэдэрацыі гарнякоў у Варшаве распачаў працу, не зважаючы на адсутнасьць ангельскае дэлегацыі, якая адмовілася прыехаць у Варшаву, з прычыны адмовы польскага консула ў Лёндане выдаць візу Артуру Куку на права выезду ў Польшчу.

У Заходняй Беларусі.

Беларускі тэатр у Вільні.

Галоўная ўправа т-ва Белшколы пастанавіла рэарганізаваць беларускі тэатр у Вільні. Запрошан новы рэжысэр тэатру, вядомы віленцам сваімі ранейшымі тэатральнымі пастаноўкамі—гр. Міхалевіч А., талентны артыст і рэжысэр. На памоцніка яму запрошан гр. Мітрафанаў. Запрошаны таксама і новыя артысты.

Школьны тыдзень.

«Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры» прыступіў да арганізаваньня на абшарах Віленскага і Наваградзкага ваяводства збору складак на беларускія школы. Будзе арганізаван «Школьны тыдзень».

Рэпрэсіі проці беларускага друку.

Па загаду камісара ўраду, № 5 „Нашай Працы“ быў сканфіскаваны за зьмяшчэньне „Пратэсту Беларускага Нацыянальнага камітэту проці арышту грам. Антона Луцкевіча“, заметкі ў хроніцы пад назвай: „Арышт правадыра беларускага адраджэньня А. Луцкевіча“, „Бел. Нац. Кам. абʼярыццэ гр. А. Луцкевіча“ і г. д.

Стачка сярэдня-нямецкіх гарнякоў.

Умовы арбітражнае камэры.

БЭРЛІН, 21-Х. Агенцтва Вольфа паведамляе: «Дзеля ліквідацыі забастовачнага руху на прадпрыемствах па выпрацоўцы бурага вугалю ў Сярэдняй Нямеччыне, арбітражная камэра ўхваліла пастанову, згодна якой у сярэднім заработак у галоўнай акрузе павялічваецца на 60 пфэнігаў. Абодвы бакі павінны заявіць да поўдня ў суботу, ці згодны яны з арбітражнай пастановай.

Шахматны турнір у Лёндане.

Становішча пасьля 9-га туру.

ЛЁНДАН, 22-Х. Барацьба на 9-м туры міжнароднага турніру маэстро ў Лёндане адбывалася з надзвычайнай упартасьцю. Хоць да канца гульні застаецца ўсяго два туры, лідэры турніру па ліку заваяваных ачкоў адстаюць адзін ад другога вельмі мала.

Становішча ўдзельнікаў пасьля 9-га туру наступнае: Тартакавэр—6½, Відмар—6, Маршаль—6, Багалюбаў—5½, Німцовіч—5, Рэті—4½, Вінтэр—4. Пры гэтым у Тартакавэра, Німцовіча і Вінтэра па адной партыі няскончанай.

За дзень.

Вінавата сыстэма.

Дзікія расправы, зьдзекі і катаваньні зьяўляюцца звычайнымі прыёмамі, якія практыкуюцца польскай адміністрацыяй на «ўсходніх крэсах», г. ё: у Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі. Варта толькі перачытаць інтэрпэляцыі «Беларускага пасольскага клюбу» і «Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады», каб прадставіць сабе, якімі канстытуцыйнымі спосабамі сучасная Польшча ўрадуе над сваімі грамадзянамі ў Зах. Беларусі.

Гэтымі днямі здарыўся ў Вільні такі надзвычайна абураючы факт, сэнс якога ў тым, што ён здарыўся іменна ў Вільні, сталіцы краю, сярод белага дня, на вачох масы людзей, а ў тым ліку і беларусаў.

З Вронак, дзе знаходзяцца арыштаваныя па справах Бел. Сялянска-Работніцкай Грамады паслы і інш. бел. дзеячы прывезьлі ў Вільню дырэктара Віл. Бел. Гімназіі гр. Радаслава Астроўскага. У Вільні гр. Астроўскага закулі ў кандалы разам з звычайным крымінальным праступнікам і такім спосабам павялі ў вастрог на Лукішкі. Увесь горад прыглядаўся да гэтай дзікай сцэны, да гэтай папяверкі над адным з найвыдатнейшых беларускіх дзеячоў. Сярод віленскіх беларусаў запанавала зразумелае абурэньне.

Нават польская газэта «Курʼер Віленскі» і тая знайшла патрэбным выказаць сваё нездаволеньне падобным учынкам польскай адміністрацыі. Яна зьмясьціла артыкул пад загалоўкам: «Факт нябывалы», у якім, між іншым, піша: «Грубая рука паліцэйскага, які налажыў кандалы на гр. Астроўскага, можа больш зашкодзіць польска-беларускім адносінам, калі гаварыць аб маральным значэньні гэтага факту, чым сам арышт выдатнага дзеяча»...

Газэта заклікае пакараць вінавайцаў зьдзеку, каб гэтым зьняць з польскай адміністрацыі пляму, якой яна не заслугоўвае.

Мы ня можам, аднак, згодзіцца з газэтай, што выпадак з гр. Астроўскім зьяўляецца «фактам нябывалым» у Польшчы. У тым-та і справа, што факты ўсялякіх зьдзекаў і катаваньняў, а часам і забойстваў адміністрацыяй беларускіх грамадзян, зьяўляюцца не выпадковымі, а сыстэматычнымі, толькі польская прэса і польская ўлада сыстэматычна хавае іх пад сукно і знарок утойвае. І гэты факт «нябывалы» схавалі-б, відаць, каб ня здарыўся ён у Вільні. Ды яшчэ невядома, ці не схаваюць усё-ж такі яго, ня гледзячы на газэтную заметку. Вядома-ж, што гады чатыры таму назад, «недатычнага» пасла сойму Сяргея Барана таксама закавалі ў кандалы і вялі па Горадні. Проці гэтага пратэставалі ў сойме і... нічога ня вышла. Толькі зьмена ўсёй сыстэмы польскага ўрадаваньня на «ўсходніх крэсах» пазбавіць нашых заходніх братоў ад далейшых сыстэматычных зьдзекаў над імі.

Канец цёмнай кампаніі.

Падпісаньне 1 жніўня савецка-пэрсідзкіх згод спаткана было жыхарствам Пэрсіі з такім захапленьнем, якога, мабыць, ня знае гісторыя дыплёматычных згод. Штодзённыя паведамленьні пра банкеты, народныя сьвяткаваньні і падзякі ўраду робяць уражаньне, што жыхарства Пэрсіі, даведаўшыся аб згодах, нібы ўздыхнула з палёгкаю.

І, сапраўды, для пэрсідзкае буржуазеі і сялянства падпісаньне гэтых згод зьяўляецца вялічэзнаю падзеяю. Пэрсія ўсе апошнія гады была ў напружаным стане палітычнае ліхаманкі, дзякуючы інтрыгам ангельскага імпэрыялізму, які ўсяляк змагаўся за ўцягненьне Пэрсіі ў кола свайго ўплыву. У гэтай барацьбе проці вызваленчага руху ангельцы абапіраліся на пэрсідзкую рэакцыю: на феадалаў, якія ў сваю чаргу абапіраліся на ангельцаў у змаганьні з ростам нацыянальнага гандлёвага капіталу і ў адцягненьні надыходзячых зьмен у іх адносінах з сялянствам; на клерыкалаў, варожых новаму цывільнаму ладу ў Пэрсіі, паколькі ён лішае іх старых падаткаў на духаўніцтва; на старую прыдворную бюракратыю, якая марыць аб аднаўленьні старое дынастыі Каджараў.

Савецка-пэрсідзкі ўгавор аб ненападзе не накіраваны супроць якое-небудзь 3-е дзяржавы. Аднак, і яго прыхільнікі і яго ворагі ведаюць, што яго ўтварэньне кладзе канец ангельскім інтрыгам, якія маюць на мэце абярнуць Пэрсію ў зброю ангельскага імпэрыялізму. Маладая пэрсідзкая буржуазея, якая зьяўляецца зараз галоўным рухавіком барацьбы за нацыянальную незалежнасьць, бачыць у савецка-пэрсідзкіх згодах і іх будучых пасьледках ажыцьцяўленьне сваёй нацыянальнай праграмы. Ужо той факт, што Касьпійскае мора ўпяршыню прызнана морам савецка-пэрсідзкім, сьведчыць аб шырокім спрыяньні СССР нацыянальнаму адраджэньню Пэрсіі.

Зразумела, што ўсе ворагі ўгавору ўзмацнілі паход проці ўгавору. Кампанія пэрсідзкае рэакцыі, інсьпіраваная і аплачаная золатам Англіі, была разгарнулася надта шырока.

І вось урад прызнаў справу ратыфікацыі згод тэрміновую справаю. Пазаўчора мэджыліс (пэрсідзкі парлямант) абсалютнаю большасьцю ратыфікаваў савецка-пэрсідзкі ўгавор аб ненападзе. Гэтым кладзецца канец цёмнай барацьбе проці савецка-пэрсідзкіх згод.

Зігзагі санацыйнай палітыкі Пілсудзкага.

Палітыка «маральнага аздараўленьня», якую праводзіць урад Пілсудзкага, амаль ня кожны дзень прыносіць неспадзяваныя для Пілсудзкага вынікі. Сойм ад яго адвярнуўся. Сэнат таксама. Паасобныя польскія партыі, нават тыя, якія лічылі ў сваіх радох шмат пілсудчыкаў (пэпээсы, вызваленцы), якія актыўна памагалі Пілсудзкаму рабіць маёвы пераварот,—цяпер адвярнуліся ад яго і сталі проці яго ў рашучую позу. Выбары ў самаўрады, на якія так спадзяваліся пілсудчыкі і на якія, як пішуць варожыя Пілсудзкаму газэты, урад кінуў вялікія грошы, прынесьлі «маральным санатарам» амаль ня поўны разгром.

Ясна, што пасьля гэтага толькі пры помачы дыктатарскіх прыёмаў Пілсудзкі з сваім урадам можа трымацца цяпер за ўладу, супроць волі аграмаднай большасьці польскага народу і ўсіх нацыянальных меншасьцяў.

Эфэкты, неспадзянкі, таямнічасьць, рэзкія выпады, рэпрэсіі, вайсковыя дэманстрацыі—усе гэтыя характэрныя для Пілсудзкага і яго ўраду прыёмы ўрадаваньня расцэньваюцца, відаць, у Польшчы не на карысьць маёвага героя, тым больш, што надзеі на палепшаньне гаспадарчых, сацыяльных і палітычных умоў польскага жыцьця, а таксама і ўрэгуляваньня спраў нацменшасьцяў—не спраўдзіліся.

Апынуўшыся ў такім бліскучым адзіноцтве, санацыйны абоз з Пілсудзкім на чале пачуў сябе ня зусім, відаць, добра.

І вось, мы бачым, што пасьля гвалтоўных атак направа і налева, пасьля штодзённых нападкаў урадавых органаў, асабліва такога прыбачнага органу ўраду Пілсудзкага, як «Глос Праўды», на пэпээсаўскі «Роботнік»,—урадавая прэса раптам крута зьмяніла тон адносна пэпээсаў і гаворыць цяпер аб іх у самых прыяцельскіх выразах. Паслухаем, што кажа паўурадавы орган «Эпока» аб выніках Лодзінскіх выбараў, на якіх пілсудчыкі атрымалі толькі адзін мандат з 80.

«Цэлае шчасьце, што на тых выпадках (лодзінскіх выбарах. Рэд.) ППС не адстае ад камуністаў і іх падарожнікаў і нават апераджвае іх; гэта дае гарантыю, што ў часе бегу ня будуць згублены дзяржаўныя мэты і інтарэсы»..

Як бачым, замест традыцыйных нападак, орган пілсудчыкаў пасылае на адрасу пэпээсаў цэлы сноп камплімэнтаў, выстаўляючы іх у процівагу камуністам дзяржаўнікамі.

Другі пілсудчыцкі орган «Глос Праўды» заяўляе, што ўрад Пілсудзкага зьяўляецца нават абаронцам пэпээсаў і наогул лявіцы.

«Ці-ж па самай сутнасьці—чытаем мы—маёвы ўрад пагражаў існаваньню і інтарэсам ППС? Такое прыпушчэньне было-б найбольшай ілюзіяй. Радыкальныя грамадзкія партыі ніколі ня мелі яшчэ такіх-жа паважных пабудак да аптымізму, як цяпер. Ад 1919 году колькасьць радыкальных выбаршчыкаў не перастававала ў нас узрастаць. У працягу васьмі апошніх гадоў у Варшаве колькасьць іх узрасла ў 4 разы. Паўтара гады маёвых урадаў палажыла канец эндэцкаму панаваньню, якое ніколі ўжо не паўстане пасьля паражкі. Разам з упадкам Эндэцыі адбываецца працэс паўстаннай радыкалізацыі выбарчых мас, доказы чаго знаходзім ва ўсіх гарадзкіх і валасных выбарах, адбыўшыхся ў працягу бягучага году... Калі параўнаць сучасную колькасьць радыкальных выбаршчыкаў з мізэрнымі лічбамі 1919 г. і прымем пад увагу няўстанны прырост гэтых галасоў, дык мусім прыйсьці да пераканаьня, што ў бліжэйшыя гады ППС і іншыя радыкальныя партыі могуць зрабіцца вялікай палітычнай магутнасьцю, калі патрапяць з'арганізаваць на сваю карысьць моцны радыкальны рух, якім прасякнуты цяпер народныя масы»...

Так сьпяваюць цяпер пілсудчыцкія органы, пасьля таго, як санацыйная палітыка з трэскам правалілася на выбарах і наогул на ўсяму фронту. Цяпер пэпээсы і іншыя радыкалы, апрача разумеецца камуністаў, прыяцелі ўраду. А ці даўно было, калі пілсудчыкі высьмейвалі пэпээсаў, як хацелі, а прыяцеляў шукалі сярод закаранелых зуброў-абшарнікаў і сьвдзілі да іх на паклон у Нясьвіж і Дзікаў.

Такімі палітычнымі зыгзагамі маёвы ўрад даказвае, што ў яго няма цьвёрдай праграмы ні палітычнай, ні сацыяльнай, ні культурнай, ні адносна нацменшасьцяў. Урад Пілсудзкага, складзены і з абшарнікаў і з сацыялістаў, увесь час шукае, на каго яму абаперціся. І калі-б аказалася, што момант дапушчае мажлівасьць апоры на абшарніках, дык тады—далоў сацыялістаў і радыкалаў, а калі гэта ня выгарае, дык гэтыя апошнія — першыя прыяцелі.

Што гэта так, што ўрад Пілсудзкага ня меў ад пачатку і ня мае цяпер ніякай праграмы, даказваецца яшчэ і тым, што ні сам Пілсудзкі, ні адзін яго міністр ніразу ні перад кім ня выступалі з якой небудзь праграмай?

Санацыя! у гэтым адным слове, якое можна разумець як хочаш, уся праграма. Але-ж, кожная партыя лічыць сваю праграму найлепшай санацыяй для дзяржавы. А тут выходзіць, што людзі, якія ня маюць ніякай праграмы, якія ўрачыста маўчаць аб ёй, хочуць, каб народныя масы паверылі аўтарытэту чалавека, які пасьля маёвага перавароту вядзе ні для каго незразумелую беспраграмную палітыку, глуміцца над усімі, як над ідыётамі, і сілаю прымушае верыць, што ён—усё...

М. Лучанін.

Хваля забастовак у Вэнгрыі.

(Ад уласнага карэспандэнта).

Пачынаючы прыблізна з сярэдзіны сёлетняга лета, Вэнгрыя знаходзіцца ў становішчы бязупыннага забастовачнага руху. Бастуюць адна катэгорыя рабочых за другой. Калі падлічыць забастоўкі толькі за апошнія тры месяцы, дык акажацца, што баставала ня менш 2/3 занятых у прамысловасьці рабочых. Да іх трэба дадаць яшчэ звыш 20 тысяч будапэшцкіх мэталістаў.

Забастовачная хваля ў апошнія часы крыху сьціхла. Але гэта ня значыць, што настрой забастовак зусім зьнік. У большасьці прадпрыемстваў вядзецца як і раней затоеная барацьба за павялічэньне заработку і палепшаньне ўмоў працы. Найменшы штуршок, і затоеная барацьба пяройдзе ў адкрыты бой.

Афіцыйна ўсімі забастоўкамі кіруюць вэнгерскія прафэсыянальныя саюзы, якія знаходзяцца ў руках сацыял-дэмакратычнай партыі. З гэтай прычыны большасьць забастовак канчалася кампрамісам. Вэнгерскія сацыял-дэмакраты горш як сьмерці баяцца рэвалюцыйнага настрою сярод рабочых. Таму яны ўсімі сіламі стараюцца, каб выбухнуўшую забастоўку зьліквідаваць у самым пачатку.

Але, на іх няшчасьце, у Вэнгрыі існуе яшчэ так званая прафэсыянальная апазіцыя, якая складаецца з камуністаў, беспартыйных і сьвядомых прадстаўнікоў с.-дэмакратычных рабочых пластоў. Апазіцыя працуе не пакладаючы рук. Яна не адзін раз выратавала становішча бастуючых. Аўтарытэт і папулярнасьць апазіцыі прафсаюзаў у часе апошніх забастовак так узрасьлі, што з ёй паліцыя Бэтлена-Хорці прымушана лічыцца ня менш, чым з самой сацыялістычнай галоўкай прафсаюзаў.

Афіцыйна забастоўкі вэнгерскіх рабочых маюць эканамічны характар. Змагаюцца за павялічэньне заработку. Хваля забастовак узьнялася ў першую чаргу ў прадпрыемствах дрэваапрацоўваючай індустрыі Да дрэваапрацоўчыкаў далучыліся рабочыя будаўнічых прадпрыемстваў. Затым пачаліся забастоўкі гарбароў, харчэўнікаў і рабочых канфэкцыйнай галіны. Усе гэтыя катэгорыі пасьля кароткай, але рашучай барацьбы дамагліся частковага задаваленьня сваіх патрабаваньняў.

Далей ідуць забастоўкі гарнякоў і мэталістаў. Рух гарнякоў пачаўся ў Пэчы і, не зважаючы на рашучае прасьледаваньне з боку афіцыйных інстытуцый і прафэсыянальнай бюракратыі, вельмі хутка ахапіў ад паловы да 2/3 рабочых гэтых галін усёй Вэнгрыі. Праводзіць забастоўку было вельмі цяжка, бо ўлада забараніла агульныя сходы. Праз некаторы час гарнякі паддаліся ўгавору с. дэмакратаў і пачалі працу на старых умовах.

Барацьба за павялічэньне заработку сярод будапэшцкіх мэталістаў пачалася з пратэсту супроць звальненьня 4.500 рабочых адной электрычнай фабрыкі. Першымі ў абарону сваіх таварышоў выступілі 7.000 рабочых фабрыкі Манфрэд-Вайс. За імі пашлі рабочыя іншых жалезаапрацоўваючых прадпрыемстваў. У выніку лік бастуючых вельмі хутка перавысіў 20 тысяч чалавек. Пратэстуючы супроць звальненьня таварышоў, забастоўшчыкі аднячасна высунулі патрабаваньне аб павялічэньні заработку на 5-15 проц.—у залежнасьці ад прадпрыемства.

У справу забастоўкі ўмяшалася ўлада. Але яна нічога не магла зрабіць. Рабочыя рашуча адмовіліся ад яе пасрэдніцтва. Тады ўрад і прадпрыемцы зьвярнуліся да правадыроў прафэсыянальных саюзаў. Капіталісты не памыліліся. Прафсаюзы выратавалі. Яны ўгаварылі рабочых, пакуль будуць весьціся перагаворы, распачаць працу. Думаючы, што прафэсыянальныя правадыры яшчэ ня зусім страцілі пачуцьцё пралетарскай салідарнасьці і інтарэсаў рабочых не прададуць, рабочыя пасьля доўгіх унутраных спрэчак паслухалі іх. Яны распачалі працу, але далі тэрміну 48 гадзін. У гэты тэрмін перагаворы з прадпрыемцамі ня далі ніякіх вынікаў, тады рабочыя зноў кінулі працу. Хто ведае, як доўга цягнулася-б гэта забастоўка, калі-б прафэсыянальная бюракратыя не заявіла, што для далейшага падтрымліваньня забастоўкі няма больш сродкаў.

Аргумант досыць важны. Пасьля нядоўгага развагаваньня рабочыя прымушаны былі згадзіцца на прапанаваную прадпрыемцамі 5-ціпроцантную надбаўку і распачаць працу. Гэта надбаўка складала прыблізна каля 70 проц. тых патрабаваньняў (у сярэднім), якія былі напісаны на сьцягох забастоўкі мэталістаў.

Прымаючы пад увагу, што апошнія забастоўкі паказалі, што аднячасна з барацьбой эканамічнага характару, рабочыя звычайна вядуць барацьбу і за рэарганізацыю прафсаюзаў, а гэта справа ўжо мае палітычнае значэньне,—урад графа Бэтлена пастанавіў выдаць спэцыяльны «забастовачны закон». Праэкт закону пакуль што яшчэ не агалошан. Водлуг чутак, увесь зьмест яго будзе накіраваны на рэгуляваньне забастовак, калі яны будуць.

Н. Н.

Будапэшт.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

„Вы сапраўды будуеце сацыялізм“.

Дэкларацыя чужаземных дэлегацый ленінградзкім рабочым.

ЛЕНІНГРАД, 21-Х. Швайцарская і бэльгійская рабочая дэлегацыі і латвійская рабочая экскурсія перад ад'ездам з Ленінграду пакінулі дэкларацыю са зваротам да ленінградзкіх рабочых. Швайцарская дэлегацыя заяўляе: на нас зрабіла нячуванае ўражаньне ўрачыстае пасяджэньне ЦВК і вялічэзная дэманстрацыя пралетарскіх мас.

Аб уражаньнях ад наведваньня заводаў дэлегацыя заяўляе: «10 гадоў назад ленінградзкі пралетарыят паказаў расейскаму народу рэвалюцыйны шлях да зьнішчэньня капіталізму. І сёньня мы бачым, што ленінградзкі пралетарыят ідзе наперад і на месцы разьбітага капіталізму будуе сацыялізм».

Бэльгійская дэлегацыя ў сваёй дэкларацыі гаворыць: наведваньне некалькіх ленінградзкіх заводаў дало нам магчымасьць пераканацца, што гаспадарамі там зьяўляюцца сапраўды рабочыя. У процівагу таму, што было пры капіталістычным рэжыме, зараз між тэхнічнымі кірункамі і рабочымі існуюць дасканалыя ўзаемаадносіны. Мы цьвёрда пераканалары, што **ажыцьцяўленьне сацыялізму няўхільна праводзіцца.** Пасля нашага звароту ў Бэльгію мы выкрыем паклёп, які ўскладаюць на СССР. **Мы зробім, што ў нашых сілах, каб ажыцьцёвіць адзіны фронт міжнароднага пралетарыяту.** Няхай жыве расейская рэвалюцыя.

СУД НАД АНГЕЛЬСКІМІ ШПІЁНАМІ.

На лаўцы падсудных працаўнікі вайсковых устаноў СССР.

МАСКВА. Увечары 21-га кастрычніка Вайсковая Калегія Вярхоўнага Суду СССР распачала разгляд справы Провэ і іншых па абвінавачаньні ва ўдзеле ў шпіёнскай арганізацыі, заснаванай сэкратаром Вялікабрытанскае місіі ў СССР Эдвардам Чарнокам.

Перад судом стаяць: Карэпанаў, ранейшы юрыс-консульт кіраўніцтва справамі Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР, К. Ф. Провэ, ранейшы кіелавод навучальна-страявога кіраўніцтва Дзяржуправы РСЧА, В. Ф. Провэ, рысавальнік ЦАГІ, Палеў, ранейшы пісар штабу 3-га стракавага палка і Падрэзкаў, ранейшы інструктар школы спэцыяльных служб вайсковапавятраных сіл РСЧА.

У пачатку судовага сьледзтва падсудны Карэпанаў падаў хадайніцтва аб далучэньні да справы дакумантаў, характарызуючых яго службовую дзейнасьць. Суд задаволіў хадайніцтва Карэпанава, затрабаваўшы паслужны сьпіс і атэстацыю Карэпанава.

Пасьля агалашэньня акту абвінавачаньня, суд запытаў у падсудных, ці прызнаюць яны сябе вінаватымі. В. К. Провэ і К. Ф. Провэ прызналі сябе вінаватымі ва ўсіх высунутых злачынствах. Карэпанаў прызнаў сябе вінаватым у тым, што перадаваў сакрэтныя ваенныя весткі Чарноку, але адхіляў прыналежнасьць да шпіёнскае арганізацыі. Панаў ня прызнаў сябе вінаватым, а Падрэзаў прызнаў сябе вінаватым толькі ў тым, што перадаваў зусім сакрэтныя весткі аб авіяцыі ў гутарцы з К. Ф. Провэ, але зазначыў, што ён ня ведаў, што Провэ займаецца шпіёнствам. Пасьля гэтага судовае пасяджэньне зачынілася.

Крэдыты саюзнай і рэспубліканскай прамысловасьці.

МАСКВА. Прэзыдыум ВСНГ СССР разьмеркаваў прызначаныя на 1927-1928 год па Ўсекабанку 66 міліёнаў р. на патрэбы прамысловасьці наступным чынам: на прамысловасьць РСФСР вызначацца 7 міліёнаў 400 тысяч руб. УССР—3 міліёны руб., БССР—500 тысяч руб. і ЗСФСР—500 тыс., на прамысловасьць агульнасаюзнага значэньня прыпадае 53 міліёны руб.

Новыя асыгнаваньні на кватэрнае будаўніцтва.

МАСКВА, 21-Х. Прэзыдыум Дзяржпляну прызнаў магчымым асыгнаваць на новае кватэрнае будаўніцтва 339.941 тыс. руб. па дзяржаўным і абагуленым сэктары і 120 міліёнаў па прыватным, што на 17 проц. больш леташніх асыгнаваньняў.

Выключэньне з партыі дэзарганізатараў.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 21-Х. Прэзыдыум акр. КК ухваліў пастанову наконт фракцыйнае працы ў ячэйцы фабрыкі абутку. Пастаноўлена выключыць з партыі за фракцыйную працу: **Каісмана, Брагінскага, Магілевіча, Стэцоўскага.** 7-мі таварышом абвешчана вымова і пастаўлена на від. У адносінах да 2-х таварышоў, выявіўшых поўную палітычную несьвядомасьць, прэзыдыум справу спыніў, прапанаваўшы ячэйцы зьвярнуць увагу на іх партыйнае выхаваньне.

Юбілейны дзень «Авроры».

ЛЕНІНГРАД, 21-Х. У зьвязку з надыходзячым сьвяткаваньнем 10-х угодак Кастрычніка ЦВК СССР асыгнаваў спэцыяльныя сродкі для больш шырокага правядзеньня сьвяткаваньня на падшэфным крэйсэры «Аврора». Гэтыя сродкі пойдуць на ўпрыгожаньне карабля, палепшаньне харчоў і павялічэньне культурнага абслугоўваньня чырвонафлётцаў

Селядцы з заграніцы.

ЛЕНІНГРАД, 21-Х. Праз Мурманскі порт аднавіўся ўвоз загранічных селядцоў для ўсяго Савецкага Саюзу. У порт прыбыў першы параход з першай партыяй селядцоў у колькасьці 25 тысяч бочак.

Дасягненьні савецкага машынабудаўніцтва.

ЯРАСЛАЎЛЬ, 20-Х. Спэцыяльная камісія скончыла выпрабаваньне вырабленых рыбінскім заводам «Мэталіст» 2-х першых у СССР запалачных машын скрынкава набіўное і скрынкава-кляільнае. Машыны прызнаны па якасьці здавальняючымі і ня ўступаюць заграмічным. Яны будуць пастаўлены на фабрыцы па вырабе запалак «Маяк».

«Мэталіст» канчае яшчэ тры машыны па вырабе запалак. У бліжэйшы час прадугледжваецца распачаць выраб аўтаматаў «Сімплекс», які будзе мачаць і прапітваць адразу паўтара міліёна запалак.

Рыбінскі завод «Мэталіст» перайшоў на выраб машын толькі нядаўна. Гэта першы ў СССР завод па запалачнай вытворчасьці.

Зьмена марскага дна каля Севастопалю.

СЕВАСТОПАЛЬ, 21-10. Штуршкі спыніліся. Наглядаецца зварот уцекачоў, выехаўшых раней з Ялты і Севастопалю.

Вярнулася навуковая экспэдыцыя, якая абсьледавала дно мора. Выкрыты па некаторай адлегласьці ад берагу значныя зьмены дна: зьнік мяккі грунт, стварыўся цьвёрды.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Камсамольскія суботнікі.

У Гомельскай акрузе, як і ў іншых мясцох СССР, наладжваюцца камсамольскія суботнікі ў карысьць бяспрытульных і для ўзмацненьня савецкае гаспадаркі.

Моладзь некаторых прадпрыемстваў і вёсак ужо дала свой пай ў агульны фонд.

У Пакалюбічах па ініцыятыве камсамольскай ячэйкі быў пастаўлены платны спэктакль, сабралі 20 руб. У Яроміне камсамольцы працавалі па збору ўраджаю фруктовага саду, за што атрымалі 60 руб. Гэтыя сродкі будуць скарыстаны: у Пакалюбічах на рамонт пажарнага абозу, а ў Яроміне—на рамонт хаты-чытальні. У бліжэйшыя дні правядуць суботнік камсамольцы Брылёўскага цагельнага заводу.

У Ветцы (цэнтр раёну) суботнік быў праведзен 19 кастрычніка. У гэты дзень было яўрэйскае сьвята і беспартыйная моладзь у суботніку ня прымала ўдзелу. Працавалі толькі камсамольцы—22 чал. Яны выгрузілі з баржы соль для спажывецкага таварыства і зарабілі 35 руб. Апроч гэтага, камсамольцы Веткі маюць намер правесьці суботнік у аб'яднаным клюбе ён зараз рамантуецца.

19 кастрычніка быў праведзен суботнік на фабрыцы „Днепр“ у Рэчыцы. Ён даў каля 300 руб. Гэтыя сродкі будуць аддадзены ў таварыства „Прыхільнікі Дзяцей“ у фонд бяспрытульных. Перад суботнікам у цэхах праводзіліся гутаркі сярод моладзі на тэму „Кастрычнік і моладзь“.

У Гомелі ў панядзелак 17-га кастрычніка працавалі два кіно-тэатры. На жаль, быў дождж і збор быў невялікі: чыстага прыбытку было—131 руб. 75 к. Гэтая справа была арганізавана моладзьдзю саюзаў „Рабпрос“ і „Рабіс“.

Суботнік быў праведзен і ў „Палеспечаці“. Працавалі ўсе камсамольцы і чалавек 100 беспартыйнай моладзі. Усяго зарабілі каля 200 руб. Моладзь выказала вялікае стараньне: у пераплётным і машынным аддзяленьнях выраб быў больш чым заўсёды.

Ячэйка акруговага зямельнага аддзелу, у склад якой уваходзіць 38 членаў, правяла працу ў савхозе „Пяскі“: камсамольцы вырылі і перанесьлі ў добрае для захаваньня места кусты бэзу (быў ачышчан вучастак у 140 кв. сж.). За гэтую працу камсамольцы атрымалі 42 р. 25 к. Грошы аддалі ў фонд бяспрытульных.

Ня зусім добра прайшоў суботнік на скураным заводзе „Пралетарскі Шлях“ у Гомелі. Камсамольцы згадзіліся працаваць але справа ня была наладжана: ня былі загатаваны лапаты і тачкі (трэба было вывезьці зямлю з двара), і ня ўсіх паведамілі аб часе пачатку працы. З прычыны гэтага ў час суботніку нічога не насьпелі зрабіць.

А. М.

Дапамога інвалідам.

ВОРША, 21-Х. На ўтрыманьне інваліднага дому ў б. маёнтку Дымава акр. аддзел. сацыяльнага забясьпечаньня асыгнаваў 13897 руб.

Рабочыя вітаюць маніфэст.

ГОМЕЛЬ, 22-Х. На сходах рабочыя вітаюць і ўхваляюць маніфэст ЦВК СССР. Яны адзначаюць, што мерапрыемствы ўраду зьявяцца лепшым падарункам працоўным да 10 гадавіны Кастрычніка.

Маніфэст яшчэ больш аб'яднае нашыя шэрагі з міжнародным пралетарыятам.

Лепшы помнік Леніну.

МАГІЛЕЎ, 21-Х. Праца па будаваньні Ўсебеларускай калёніі для бяспрытульных ідзе напружаным тэмпам. Будуецца агульнае памяшканьне, сямігодка, майстэрні: кавальска-сьлясарная, кравецкая, шавецкая. Закладзены садовы гадавальнік і плянтацыя хмелю. Пабудова калёніі будзе каштаваць 88000 руб. Да 10 гадавіны Вялікай Рэвалюцыі 150 бяспрытульных дзяцей Беларусі атрымаюць карыснае месца вучобы і працы.

70.000 руб. на рамонт і будаўніцтва.

Гомель, 17-Х. Рабпанк гэтым летам здаволіў рамонтна-будаўнічым крэдытам 600 рабочых і служачых на суму ў 70.000 руб. Камісія гарсавету рабіла праверку і канстатавала, што гэты крэдыт скарыстаны па прызначэньню.

Абсьледваньне каапэрацыі.

Гомель 19-Х. Акруговы прафэсыянальны савет вылучыў камісію для вывучэньня працы каапэрацыі ў галіне дастаўкі сельска-гаспадарчых прадуктаў. Камісія азнаёмілася з працай ЦРК і чыгуначнага спажывецкага таварыства.

ЛЕСАРАСПРАЦОЎКІ.

БАБРУЙСК, 22-Х. Аддзяленьне Лесбелу мяркуе распачаць лесараспрацоўкі па акрузе ў лістападзе месяцы. Сёлета будзе высечана лесу на плошчы звыш 2000 дзесяцін.

ЭПІДЭМІЯ ШКАРЛЯТЫНЫ.

ЖЛОБІН, 21-Х. У Жлобіне і Будзе-Кашалёўскай зьявілася эпідэмія шкарлятыны. Прыняты меры да стрыманьня пашырэньня эпідэміі: робіцца насельніцтву прышчэпкі супроць шкарлятыны, тлумачацца спосабы перасьцярогі і г. д.

КРЭДЫТАВАНІЕ БЕДНАТЫ.

БАБРУЙСК, 22-Х. За год працы крэдытнае т-ва «Чырвоны Араты» выдала з фонду беднаты 150 пазык на суму 11560 руб.

СТРАТЫ АД АГНЮ.

ВІЦЕБСК, 22-Х. За апошні год страты ад пажараў па акрузе складаюць 88.457 руб. Па абавязковаму акладному страхаваньню за згарэўшыя 1393 будынкі выплачана страхоўкі 50.377 руб., па дабрахвотных і датковых страхаваньнях—29163 руб.

Згарэла ў акрузе за год у адносінах да ўсіх застрахаваных сялянскіх двароў 7,4 проц. двароў.

800 ТЫСЯЧ НА ПРАМЫСЛОВАЕ БУДАЎНІЦТВА.

ГОМЕЛЬ, 22-Х. У мінулым апэрацыйным годзе запалкавы трэст скарыстаў 797971 руб. на прамбудаўніцтва. Большая частка сродкаў была скарыстана на будаўніцтва ў Рэчыцы на фабрыцы «Днепр».

Водгукі на маніфэст.

Сяляне—аб маніфэсце.

(ГУТАРКА З СЯЛЯНАМІ, АРГАНІЗАВАНАЯ РЭД. ГАЗ. „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ У ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ СЕЛЯНІНА).

Сабралася да 40 чалавек сялян, якія прыехалі з розных куткоў Беларусі.

Па розных справах апынуліся яны ў Менску. Аб маніфэсьце яшчэ ніхто з іх ня чуў.

Абвестка, якая паведамляла, што сёньня адбудзецца гутарка аб маніфэсьце, выданым сэсіяй ЦВК БССР, сабрала ўсіх у чытальні Дому Селяніна.

Загадчык аддзелам друку ЦК КП(б)Б тав. Сянкевіч у простых і зразумелых словах растлумачвае кожны пункт маніфэсту.

Уважліва слухаюць. Як толькі дайшло да практычных мерапрыемстваў, пра якія гаворыць маніфэст, слухачы адразу ажывіліся: на іх тварах засьвяцілася радасьць.

УСТУПНАЯ ПРАМОВА ТАВ. СЯНЬКЕВІЧА.

— Гэты маніфэст перадрукаваны ўсімі замежнымі газэтамі, зьяўляецца найстрашнейшай куляй па капіталістычным сьвеце.

Больш ўсяго Кастрычнікавая рэвалюцыя дапамагла сялянству ў нас у БССР, дзе насельніцтва знаходзілася пад сацыяльным і нацыянальным уціскам.

Рэвалюцыя ў нас дала сялянству 1 міл. 300 тысяч дзесяцін зямлі. У 1925 годзе былі яшчэ разьмяркованы паміж бяднейшым сялянствам абрэзкі, потым лясныя і бросавыя землі.

Імпэрыялістычная вайна найбольш разбурыла нас. Пасьля нямецкая і дзьве польскія акупацыі канчаткова дабілі нашу гаспадарку. Ня гледзячы на тое, што паноў мы прагналі толькі ў 1921 годзе, усёж-такі за гэты кароткі час шмат чаго зрабілі.

З кожным годам у нас памяншаецца колькасьць няпісьменных.

У нас, у Беларусі, зараз ёсьць 4 вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе набываюць асьвету рабочыя і сяляне.

У большасьці вёсак у нас ужо ёсьць лямпачка Ільліча.

Тав. Сянкевіч спыніўся на кожным з пунктаў маніфэсту асобна, падкрэсьліўшы значэньне практычных мерапрыемстваў для працоўных.

БЮРАКРАТЫЗМ ЗАЯДАЕ.

— Маніфэст,—кажа селянін з адной вёскі каля Менску,—рэч добрая, і мы, сялянства, яго ўсе вітаем. Але чаму-ж гэта наш сельсавет абклаў падаткам чалавека, які мае толькі 1 з паловай дзесяціны зямлі?

У нас у сельсавеце бюракраты сядзяць...

БЮРАКРАТЫЗМ—ЗЬЯВІШЧА ЧАСОВАЕ

з абурэньнем адказвае яму селянін Лісьнеўскі з хутару Весялова, Бераўскога сель - савету, Заслаўскага раёну.

— Я,—кажа ён,—сын батрака, атрымаў ад улады 4 дзесяціны зямлі, нажаў 26 коп жыта. Заплаціў падатку 6 руб. 75 кап., а цяпер, мусіць, зусім асвабадзяць дзякуючы маніфэсту ад падатку. Нават тады, калі і плацілі падатак, ня скардзіліся, бо мы паспрабавалі панскі бізун.

Раней ад страхкасы атрымоўвалі дапамогу толькі рабочыя, цяпер, згодна маніфэсту, дапамога будзе давацца і нашым старыкам.

Бываюць няправільнасьці ў нашых вёсках. Бюракратызм адным махам ня зьнішчыш. Паступова мы і ад бюракратаў пазбавімся.

Маніфэст нам трэба толькі вітаць.

«ШКАДА, ШТО СПАЗЬНІЛІСЯ».

Селянін Вайцяхоўскі з вёскі Сямёнавічы, Уздзенскага раёну, кажа:

— 10 год існаваньня савецкай улады паказалі селяніну, што яго становішча з кожным годам паляпшаецца. Нашы дзеці маюць цяпер дармовае навучаньне. Мы плоцім цяпер меншы падатак.

Сэсія ЦВК вельмі добра падышла да вырашэньня ўсіх нашых пытаньняў.

Нараканьні на няправільнасьці, пра якія гаварыў першы прамоўца-селянін хутка зьнішчацца. Маніфэст мы павінны вітаць. **Я прапаную ад імя ўсіх нас, сабраўшыхся тут, паслаць прывітальную тэлеграму сэсіі ЦВК СССР.**

Тав. Сяньковіч інфармуе, што сэсія ўжо скончылася, на што селянін заяўляе: «Шкада, што спазьніліся».

УЛАДА ДОБРА РОБІЦЬ.

Селянін Казлоўскі з вёскі Парошня Гомельскай акругі, кажа:

— Улада добра робіць, праводзячы, гэткія мерапрыемствы. Усё гэта яшчэ больш палепшыць наша становішча.

Бываюць і недахваты ў вёсцы: далі грошы на землеўпарадкаваньне, але яно не заўсёды правільна адбываецца гэтае землеўпарадкаваньне.

Селянін Батура, Лупалаўскага раёну, Магілеўскай акругі, шмат гаварыў аб нашых дасягненьнях пры савецкай уладзе. Батура заклікаў сялян вітаць маніфэст і яшчэ цясьней згуртавацца вакол камуністычнай партыі.

Інвалід-селянін на фактах пералічыў нашы дасягненьні за 10 год.

* * *

2 гадзіны таварыскай гутаркі няпрыкметна прайшлі.

Прамовы сялян, якія дзякавалі ўладзе за клопаты аб іх дабрабыце, радасьць старыка, які толькі і змог сказаць:

«Добры маніфэст. Пра нас, старыкоў, не забылі», цягнуліся і пасьля сходу.

Да позьняй ночы ў інтэрнаце ішлі паміж сялянамі гутаркі аб маніфэсьце юбілейнай сэсіі ЦВК.

Савецкая ўлада дапамагае адраджэньню сельскай гаспадаркі.

Абнародаваны да 10-х угодкаў Кастрычнікавай рэвалюцыі вышэйшым урадавым органам маніфэст для сялянства мае вялікае значэньне, бо ён вызваляе ад сельска-гаспадарчага падатку яшчэ 10 проц. сялянскіх гаспадарак, касуе запазычнасьць па пазыках, атрыманых сялянствам у 1924-25 г.. здымае з беднякоў і дае ільготы серадніякам па недаімцы сельска-гаспадарчага падатку за мінулыя гады, а таксама прымае на кошт дзяржавы землеўпарадкаваньне ўсіх бядняцкіх і незаможных серадняцкіх гаспадарак і дадаткова асыгнуе на гэту патрэбу 10 міліёнаў рублёў.

Таксама вялікае значэньне мае маніфэст у той частцы, якая прапануе ўраду распрацаваць закон аб прыпыцьці на дзяржаўнае забясьпечаньне старыкоў з незаможных сялянскіх гаспадарах. жыцьцё якіх у бядняцкіх гаспадарках часамі зьяўляецца занадта цяжкім.

Апроч таго, пераход прамысловасьці ад 8-гадзіннага рабочага дню да 7-гадзіннага дае магчымасьць увесьці на фабрыках і заводах новую зьмену рабочых, якая дасьць працу тым беспрацоўным, што, не знаходзячы сабе працы ў сельскай гаспадарцы з прычыны малай яе даходнасьці, імкнуцца з вёскі ў горад.

Усе гэтыя мерапрыемствы, якія праводзіць наш урад для сельскай гаспадаркі, лішні раз гавораць аб тым, што толькі савецкая ўлада дапамагае селяніну выводзіць сваю сельскую гаспадарку з таго эканамічнага заняпаду, у якім адвеку трымаў яе царскі ўрад.

Селянін-член ЦВК БССР КОЗЫРАЎ.

— Гаворачы аб значэньні маніфэсту, я спынюся толькі на 2-х пунктах яго: аб павялічэньні пэнсіі інвалідам вайны і забесьпячэньні старыкоў з бяднейшых сялянскіх пластоў.

Павялічэньне фондаў на забесьпячэньне інвалідаў вайны дасьць магчымасьць палепшыць матар'яльны стан усіх груп інвалідаў вайны, якія маюць права атрымліваць пэнсію.

Будзе павялічана ня толькі пэнсія інвалідам, але значна пашырыцца і кантынгэнт іх.

Ня менш важнае значэньне мае праэкт забесьпячэньня старыкоў-сялян з бядняцкіх сем'яў. Ні для каго не зьяўляецца сакрэтам, што вельмі часта бедняку-селяніну на старасьць няма куды прытуліцца. Дзеці бываюць добрыя, пакуль малыя, а як падрастуць, дык часта мала дбаюць аб сваіх бацькох. Не дарма існуе народная прыказка; «Гадаваў мядзьведзь дзеці, а няма прыкім сядзеці». Старым людзям, асабліва ў бядняцкіх гаспадарках, прыходзіцца часамі ісьці жабраваць.

Савецкая ўлада сваім законам, які будзе ўнесен на зацьверджаньне чарговага зьезду саветаў, спыніць, урэшце, гэту чалавечую несправядлівасьць: яна дасьць магчымасьць кожнаму бедняку мець спакойную, забясьпечаную старасьць. А да гэтага часу ня кожны бедняк-селянін гэта мае.

Нар. Кам. Сац. Забясьпекі КАЛІНІН.

— 7-мігадзінны рабочы дзень зьяўляецца вялікім дасягненьнем рабочае клясы. Мы ўпэўнены, што скарачэньне рабочага дня ня зробіць нікага ўплыву на скарачэньне вытворчасьці. Наадварот, у зьвязку з павышэньнем прадукцыйнасьці працы і рацыяналізацыі нашае прамысловасьці, выпрацоўка рабочых ня зьменшыцца.

СТРАКОЎСКІ.

Як адбудзецца ў БССР пераход на 7-х гадзінны рабочы дзень.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам нам. наркома працы тав. АЛЕСІН паведаміў, як адбудзецца ў БССР пераход на 7-хгадзінны рабочы дзень.

Для рабочых БССР гэты пераход мае яшчэ большае значэньне, чым для рабочых цэнтральна-прамысловых губэрняў, бо рабочыя БССР знаходзіліся да рэвалюцыі ў больш цяжкім становішчы, чым рабочыя другіх вобласьцей.

Пераход адбудзецца пасьля грунтоўнай прапрацоўкі гэтага пытаньня, каб максымальна скарыстаць гэты пераход для паляпшэньня становішча рабочых і для ўцягненьня магчыма большага ліку беспрацоўных у прамысловасьць.

У першую чаргу пераход на 7-хгадзінны рабочы дзень можна будзе праводзіць у пераабсталяваных прамысловых прадпрыемствах і найраней у тых, якія працуюць безперапынку ў 2—3 зьмены.

Наркампрацы БССР гэтым пытаньнем скора займецца і адразу, пасьля падрыхтоўкі, мы прыступім да рэальнага ажыцьцяўленьня пераходу на 7-хгадзінны рабочы дзень.

Ва ўмовах Беларусі ўжо ў бліжэйшыя 1—2 гады частка буйнай прамысловасьці будзе пераведзена на 7-хгадзінны рабочы дзень.

Амэрыканская пазыка Польшчы.

Нарэшце-такі Польшча атрымала амэрыканскую пазыку, аб якой ішлі такія доўгія, шматмесячныя перагаворы. У афіцыёзным урадавым друку Польшчы-радасьць і крыклівая самарэклама: толькі ўраду маршала Пілсудзкага ўдалося атрымаць такую вялікую пазыку! Аднячасна з гэтым у апазіцыйных газэтах наглядаюцца першыя насьмешлівыя пробы процпаставіцца афіцыёзнаму лікаваньню і адзначыць ценявыя бакі пазыкі.

Пазыка, якую Польшча цяпер атрымлівае, сапраўды зьяўляецца вельмі значнаю па сваёй велічыні і будзе мець вялікае значэньне. Праз гэтую пазыку амэрыканскі фінансавы капітал атрымоўвае вельмі моцны ўплыў як на польскую эканоміку, так і на ўнутраную і замежную палітыку Польшчы. Уплывы гэтыя будуць адчувацца на працягу многіх гадоў, да камплексу пытаньняў, зьвязаных з пазыкаю, прыйдзецца вярнуцца яшчэ ня раз. Цяпер-жа абмяжуемся самымі асноўнымі ўвагамі.

Доўгі час папярэдніх перагавораў ужо сам па сабе наводзіць на думку, што ўмовы пазыкі зьяўляюцца нялёгкімі, калі польскі ўрад так доўга не адважваўся іх прыняць. Праўда, у часе перагавораў удалося трохі зьмякчыць першапачатковыя ўмовы, пастаўленыя амэрыканскімі банкірамі, але ўсё-ж яны застаюцца досыць цяжкімі, і нямецкая газэта „Тэгліхэ Рундшау“ так адазвалася аб іх: «Калі Польшча мусіла згадзіцца на такую ўмову (устанаўленьне амэрыканскага кантралёра),—дык гэта даводзіць, што ўжо гарэў дах над яе галавою».

Зацяжнасьць перагавораў польскі афіцыёзны друк тлумачыў тым, што нібы-та на амэрыканскім рынку даволі цяжка разьмясьціць такую вялікую пазыку. Недарэчнасьць падобнага «довада» выяўляецца вельмі яскрава пры абзнаямленьні з агульнымі лічбамі замежных пазык, штогодна разьмяшчаемых у Злучных Штатах. З вестак, якія падае „Экономическая Жизнь“ за 11 кастрычніка, відаць, што амэрыканскі грашовы рынак яшчэ дужа далёкі ад насычэньня яго замежнымі пазыкамі, і кожны год разьмяшчае іх усё болей і болей. Калі ў першай палавіне 1922 гаду было разьмешчана 70 мільёнаў даляраў, дык у 1922 годзе (таксама за І палавіну), ужо 508 млн. дал. У 1923 г. наглядаецца зьніжэньне да 173 млн. дал. (за І пал.), але ў 1926 г. ізноў 525 млн. дал. (за І п.), а ў 1927 г. (за І пал.)—696 млн. дал. Пры такіх лічбах разьмяшчэньне 72 млн. дал. на вельмі выгодных варунках не зьяўляецца цяжкаю справаю.

Што датычыць апрацэнтаваньня, дык унутраныя амэрыканскія пазыкі даюць 3-4 проц. З замежных краёў найболей выгоднымі ўмовамі карыстаецца Канада, якая атрымлівае пазыкі па 4,55 і 4,89 проц. Далей ідзе Аўстралія—5,25 проц, і іншыя ангельскія даміпіі. Даючы ім пазыкі на выгодных умовах, амэрыканскі капітал усё болей і болей забірае іх у свае рукі і ўсё болей аслабляе іх сувязь з Англіяй. Тамжа, дзе падобныя меркаваньні ня маюць месца, процант па пазыках звычайна трымаецца паміж 7 і 8 проц у год. Югаславія за сваю 30—мільённую пазыку плаціць 7,6 проц., розныя італьянскія месты 7,19—7,62 проц., найвышэй апрацэнтоўваюцца чылійскія пазыкі—8 проц. Польская пазыка мае апрацэнтаваньне: 7 проц. гадавых з намінальнае сумы пазыкі, і з гэтага боку здавалася бы, што ўсё ў парадку. Але справа зьмяняецца, калі мы возьмем пад увагу эмісійны і выкупны курсы. Чэхаславацкая пазыка 1922 г. была выпушчана на курсу 96,5 пры 7,5 проц. гадавых. Югаслаўская—па курсу 95,5 проц. і выкупным курсе 110 праз 15 гадоў, альбо 100 праз 35 гадоў.

Польская пазыка мае эмісійны курс 92, а выкупны—103 пры 7 проц. гадавых. У гэтым сэнсе яна вельмі блізка падыходзіць да пазыкі, атрыманае Нямеччынаю па пляну Даўэса. Эмісійны курс Даўэсаўскае пазыкі таксама 92, апрацэнтаваньне—7 і выкупны курс—105, так што польская пазыка нават як бы трохі дагаднейшай Даўэсаўскае. Але пры гэтым трэба мець на ўвазе, што Даўэсаўская пазыка давалася Нямеччыне тады, калі апошняя толькі—толькі пачынала вылазіць з балота пасьляваеннае інфляцыі і разладжанасьці гаспадарчага жыцьця. Затое пазьнейшыя нямецкія пазыкі ў Нямеччыне значна дагаднейшыя. Баварская пазыка ў мінулым годзе мае эмісійны курс 92,75, апрацэнтаваньне—6,5, выкупны курс—100; пруская пазыка ў тым же годзе (13 верасьня) мае эмісійны курс 95, апрацэнтаваньне—6,5 і выкупны курс—100; бэрлінская электроўня ў самым канцы мінулага году атрымала пазыку па эмісійнаму курсу 98, з апрацэнтаваньнем—6,5 і выкупным курсам—100. Такім чынам на працягу аднаго толькі году нямецкія пазыкі ў Амэрыцы зрабілі значны крок наперад у справе палягчэньня іх умоў. У параўнаньні з імі ўмовы сучаснае польскае пазыкі выдаюцца сапраўды надта цяжкімі.

Польшча атрымоўвае пазыку ў 62 мільёны даляраў і 2 мільёны фунтаў стэрлінгаў (разам каля 72 млн. дал.) на 20 год пры эмісійным курсе 92, апрацэнтаваньні—7 проц. і выкупным курсе—103. Пазыка будзе сплачвацца роўнымі часткамі штогодна. Беручы ўсё гэта пад увагу, «Кур'ер Польскі» (№ 281) падрахоўвае, што фактычнае апрацэнтаваньне будзе даходзіць да 9 проц. у год. Тут трэба заўважыць, што яно будзе яшчэ большым, бо „Кур. Пол.“ ня ўзяў пад увагу камісійных, якія будуць заплачаны амэрыканскім банкам за разьмяшчэньне пазыкі. Польскі ўрад не выказвае, колькі яму прыдзецца плаціць гэтых камісійных. Немцы плацілі 3 проц. Адносна Польшчы пры гэтагодніх веснавых перагаворах у газэтах пісалася аб 4 проц. Калі адняць іх таксама, дык з кожнае намінальнае сотні Польшча фактычна атрымала бы нават не 92, а толькі 88 і канчатковае фактычнае апрацэнтаваньне пазыкі дайшло бы да 9,5 проц. Другімі словамі: нават з чыста фінансавае стараны ўмовы польскае пазыкі горшыя, чым умовы пазык, атрымліваемых у Амэрыцы любым іншым краем. Гэта—асноўны, вельмі важны факт, які трэба адзначыць, бо нават апазіцыйныя польскія газэты абходзяць яго маўчаньнем. Ён азначае, што Амэрыка зусім ня мае веры ў польскую салідпасьць і ўстойлівасьць. Амэрыканскія капіталісты лічаць, што пазычаньне грошай Польшчы зьвязана з большаю рызыкаю, чым пазычаньне любой іншай дзяржаве і што адпаведна з гэтым і процанты, і ўмовы сплаты павінны быць іншымі. Што няпоўнасьць амэрыканскіх банкіраў да Польшчы карэніцца не ў фінансавых прычынах, паказваюць такія лічбы. 31 ліпеня г.г. на аднаго жыхара Польшчы прыходзілася 13,5 даляраў дзяржаўных даўгоў (326 млн. зл. унутраных і 3.261 млн. зл. замежных на ўсю Польшчу), у Югаславіі—39 дал., у Чэхаславакіі—77 дал., у Нямеччыне—183 дал., у Францыі—534 дал. і ў Англіі—937 дал. Пры такіх лічбах ясна, што калі-б справа пазыкі вырашалася толькі фінансавымі меркаваньнямі, дык Польшча магла-бы яшчэ шмат карыстацца замежным крэдытам раней, чым яна дасягнула бы абцяжарнасьці замежнымі даўгамі хаця-бы ў такой меры, як яе славянская суседка Чэхаславакія, не гаворачы ўжо аб Нямеччыне.

Але мала таго, што пазыка дадзена на такіх пязвычайных умовах, яе выплата забясьпечана яшчэ даходамі ад мытаў, якія павінны ўносіцца ў банк на спэцыяльны рахунак, а не паступаць адразу ў распараджэньне ўраду. Калі ўзяць пад увагу, што ранейшыя пазыкі Польшча таксама атрымлівала пад заклад альбо дзяржаўнае маемасьці, альбо дзяржаўных манаполяў, дык малюнак „даверыя“ да Польшчы з боку замежных капіталістаў будзе яшчэ яскравейшы. Так ужо аддадзены ў заставу: тутунёвая манаполь (за італьянскую пазыку), запалкавая манаполь (за швэдзкую пазыку), акцыз з цукру і даходы з чыгунак (за пазыку Дыльлёна), а цяпер яшчэ мыты. Ва ўсіх гэтых галінах эканамічнага жыцьця Польшчы польскі ўрад не зьяўляецца болей поўным гаспадаром, а абмяжаваны на карысьць замежных капіталістаў.

Варункі скарыстаньня апошняе пазыкі, зьвязаныя з увядзеньнем у раду польскага банку амэрыканскага „дарадцы“ з абшырнымі паўнамоцтвамі настолькі цікавыя і настолькі цяжкія дзеля Польшчы, што заслугоўваюць разгляду ў асобным артыкуле.

М. С.

Па чатырох краінах.*).

Уражаньне і сапраўднасьць.

Рыга.

К прыходу нашага цягніка на вакзале ў Рызе сабралася вагромістая маса народу. З якое прычыны было гэта—мы, зразумела, ня ведалі. Дагадваліся, што віноўнікамі былі тыя-ж салдаты-адпускнікі, вялікая колькасьць якіх даехала да Рыгі з Дзьвінску і, пэўна, сьледавала далей.

Мы спакойліва прайшлі праз шчыльныя шпалеры публікі ў вакзал, дзе таксама было бітком набіта людзей. Цесна было прабіцца на вуліцу.

Але вышаўшы з вакзалу, мы ўгледзелі, што падворак далёка не ажыўлены, як таго трэба было чакаць для Рыгі. Двума шарэнгамі выцягнуліся паўз вакзал рэмізьнікі ды таксі. Паколькі мы бачылі, іх мала хто браў: пасажыры, што выходзілі з вакзалу, напіху раставалі ў нас на ваччу, губляючыся ў зироку бліжэйшых вуліц... Мажліва тая грамада людзей, што прышла на спатканьне адпусьнікоў, вышаўшы з вакзалу, разабрала вартаваўшых рэмізьнікаў і таксі—мы хутчэй накіраваліся ў «Камэрчаскі Гатэль», каб пасьпець ахапіцца з дарогі і пайсьці дзе-кольвечы павячэраць...

Праз паўгадзіны мы ізноў ачуліся на вуліцах Рыгі. Часу было пачатак дванаццатае, як быццам бы і ня зусім позна. Тым ня менай на вуліцах—пінога. Рэдкія, выпадковыя праходжыя, ды на скрыжаваньнях—бравыя, стройныя гарадавікі. Магазыны на запорах; ноцныя жалезныя стаўні. Зирок. Ліхтары губяць сьвятло ў гушчыні дзярэў Вэрманска а парку. У крывых вузкіх вуліцах старога гораду—зусім мала сьвятла. Мы павярнулі ў новую частку гораду. Прайшлі некалькі вуліц, шукаючы якога-кальвечы рэстарану—няма. Рэдкія кавярні, адно ці дзьве танцдыльле з зацяжнымі гукамі джацбанду. Старэнькая газэтчыца-немка, на запытаньне, дзе павячэраць, наслала нас у рэстаран парку, дзе мы і знайшлі сяго-таго перакусіць.

Рэстаран выглядаў пустым, закінутым—тое-ж бязьлюдзьзе, што іў самым горадзе... Назаўтра мы дазналіся, што віною гэтае пустэчы—цёплая летняя пагода, якая стаяла ў Рызе ў час нашага прыезду. Многа жыхароў на дачах... не пачаўся васеньні сэзон... І, сапраўды, назаўтра, у нядзелю, Рыга выглядала ніколькі ня шумней учарашняга. Тыя-ж пустыя, вольныя вуліцы. Толькі грукат бясьнечнага трамваю.

Жыхарства за горадам, на ўзмор'і. Хто ня ў моцы мець дачу, адправіўся туды раньнем. Запазьнёныя—сьпяшаць хоць колькі часу пабыць за горадам, каб пасапсьці вольным паветрам.

Цягнікі адзін за другім, праз кожныя 15 хвілін лясуцца к заліву, вывозячы з гораду сотні людзей. Сіняе неба і цёплае яскравае сонца вабяць і нас пакінуць горад разам з другімі. Але гэтаму перашкаджае пачуцьцё цікавасьці. Мы—чужаземцы і прыехалі аглядзець сталіцу Латвіі, дзе маем прабыць ня болей пяці дзён. Пасьпець-бы выпаўніць за гэты час ускладзеныя на сябе абавязкі!

І зранку мы ідзём аглядаць Рыгу. Накіроўваемся Вэрманскім паркам, чыстымі, папямецку прыбранымі дарожкамі на паркавую, усю ў зелені горку. Адтуль спускаемся ў стары горад. Наведваем музэйную, крывую вузкую вуліцу. Нясе спрадвячэчам: вузкія домікі, з дробнымі вакенцамі, лепяцца адзін да другога, цісьнучы запакаваныя ў іх сем'і жыхароў. Вечная цень... У канцы вуліцы—астаткі брамы-варот, якія некалі зачыраліся нанач, каб не дазволіць ні ўвайсьці, ні выйсьці з гораду. Яшчэ відаць вагромністыя іржавыя прабоі... На другой, гэтакай-жа вузкай і цеснай вуліцы, глядзімо старасьвецкія сьвірні... Іх поўная вуліца... Побач іх і ў пярэмежку зноў-жа старыя дамы. Паогул, у старой часьці гораду, зараз бойкім гандлёвым мейсцам Рыгі, шмат і шмат чаго гістарычна цікавага. Мы абагам праглядаем цікавыя будынкі дамоў, сьпічастых кірхаў, палацу быўшага дваранскага сабраньня, а зараз—сойму, і выбіраемся на ўзьбярэжную Дзьвіны.

І вось, кідаючы ўзрокі ўверх, мы не абмінаем заўважыць адно-надзвычайную чыстату вуліц гораду. Усюды і навакол—падмецена, падчышчана, прыбрана. Акуратнасьць—цалкам нямецкая, выгляд гораду таксама. Відаць, апроч усяго, што латышы стараюцца глядзець за сваёю сталіцаю, як мае быць. Для яе яны не шкадуюць сродкаў, абы надцягнуцца за Эўропаю. Напэўна, ня лёгка даецца гэта рабочым і сялянам Латвіі, на плячох якіх ляжыць вагромністы дзяржаўны апарат рэспублікі і досыць значны слой дармаеднага шыберства. Дзяржаўны бюджэт, перасягаючы 200 мільёнаў латаў, сваёю актыўнаю часткаю апіраючыся на лес і лён ды транзітныя зборы—не малы цяжар для дробнай сельска-гаспадарчай краіны. Трэба моцна натужвацца, каб вывернуцца, ня маючы жаднай прамысловасьці і мусячы трымаць армію, сякі-такі марскі і паветраны флёт, будаваць культуру, утрымліваць Рыгу.

І патужваюцца... Праз падаткаў, налогаў і рознага выгляду збораў шчыльна апускаецца на сьпіну жыхарства. Бяднейшыя слаі яго вельмі балюча адчуваюць уціск гэтага праса. Безрабоцьце, малая заработная плата тым, хто мае сюю-тую работу, зводзіць жыцьцёвы мінімум да мізэрнасьці. Прывозныя, галоўным чынам, нямецкія ды ангельскія тавары, маладаступны пераважнай большасьці гарадзкога жыхарства (служачыя, рабочыя, дробная інтэлігенцыя). Я кажу гарадзкога, бо бяднейшае сельскае жыхарства шырока культывуе доматканыя вырабы... Багацейшая хутаранская частка сялян, якіх шмат у Латвіі, гэтак, як і шырокі слой гарадзкое гандлёвае буржуазеі, вядома што ня так адчуваюць цяжар жыцьця. Але такіх значная меншасьць... Большасьць...

А вось і Дзьвіна! Мы пакідаем гутарку на эканамічныя тэмы і заглядаемся шырынёю пашае рэчкі. Яна тут, у Рызе, разьліваецца на кілёмэтры ў шырыню, сустракае і праводзіць акіянскія параходы, прапускае мноства плытоў беларускага і латвійскага лесу, які часткаю застаецца ў Рызе, а ў большасьці ідзе далей, у Эўропу...

Мы адвяртаемся ад Дзьвіны і глядзімо на чорны засмулены замак, абведзены сьцяною. На сьцяне тупае вартавы з вінтоўкаю,—на башні замку—узьняты нацыянальны сьцяг. Нам паведамляюць, што гэта адзначае аб прысутнасьці ў доме прэзыдэнта рэспублікі. Ён жыве ў замку быўшых губарнатараў. Паміж іншым, у частцы гэтага вялікага будынку зьмяшчаецца і латыскі нацыянальны музэй. Мы абходзім вакол замку, накіроўваючыся ізноў у горад... Дарогаю радзімся, як і калі ехаць на ўзмор'е. М. Чарот выказвае жаданьне праехаць на таксі; яго падтрымлівае М. Зарэцкі. Урэшце спыняемся на цягніку.

Пасьля абеду едам на Strand (марскібераг), надзвычайна жывапісная мясцовасьць. Дачы пачынаюцца непасрэдна ад гораду і запаўняюць сабою ўсе хвойныя ляскі і пералескі. На дачах—паўнютка народу... Але на Strand'зе—хмары людзей. Безканечны бераг заліву ўсыпаны рознастайнаю публікаю даадказу. Цягнецца купальны сэзон...

Рэштку дню мы прысьвячаем агляду цікавых прыгожых мясьцін Рыжскага ўзмор'я. Назаўтра—за культурныя справы.

З. ЖЫЛУНОВІЧ.

(*Далей будзе*).

*) Гл. „С. Б." № 240.

Вежа.

Заснула вежа. Што ёй сьніцца?..
Стаіць панурая, як здань.
Была турма тут, ці званіца —
хто можа гэта адгадаць?..

І час сівы наўкола бродзіць,
як бег хвілін, як крок гадзін;
і нязьлічоныя стагодзьдзі
на шэрым камені ляглі.

Вякі стаяла без работы—
гняздо лягенд і кажаноў...
А сёньня людзі ў цяжкіх ботах
на сходах тупаюць ізноў...

Зьвязалі вежу дзіўным строем.
Тут не разблыталі-б канцы
ні скандынаўскія героі,
ні царгародзкія купцы.

І к сэрцу вежы прывязалі
драты ўстрывожаную даль.
О, прадзеды, каб вы пазналі
антэны стынучую сталь!..

О, вам ня знаць, як ваша вежа,
знайшоўшы працу над канец,
зьбірае гоманы з бязьмежжа
на свой зіяючы вянец.

АЛ. ДУДАР.

У завірусе дзён.

I.

Мы йшлі ў ануччах,
Мы босыя йшлі.
І чуўся пявучы
Змаганьня заклік.

Ды вецер халодны
Нам песьню адну
Пяяў пра паходні
Ў лахмоцьці ануч.

Варожыя сілы
Нас клікалі ў бой,
Галодных асілкаў
Прызыўнай трубой.

Мы йшлі на змаганьне,
Галодныя йшлі,
Пад новым сьвітаньнем,
Пад бацькаўскі кліч.

Зялёныя шаты,
Высокі асьнік,
Сялянскія хаты
Ішлі бараніць.

Выходзілі людзі,
Праводзілі нас:
«Хай добры вам будзе
У дарожаньцы час».

II.

Высахлі вочы,
Сьлёз няма.
Вораг павоўчы
Націснуў на нас

Стальлю халоднай
І волавам куль.
Чакаць дапамогі
Адкуль, адкуль?

Варшаўскае поле
Нябёс сінь.
Палітыя кроўю
Растуць аўсы.

Акопы, акопы—
Крок,
Сьмерць!
Пад Перакопам
Націснуў зьвер.

І мы пакляліся,
Мой друже, ізноў
Галаву з бою
Аддаць з табой.

Мы верылі ў шчасьце
Ў перамогу жыцьця.
З Бярозы да Віслы
Пранесьлі сьцяг.

III.

Вораг, вораг!
З Белавежы
градам куль.
Сыпанулі
у рассыпную
хто адкуль.
Коні, людзі,
людзі коні;
крык і звон.
Мчыцца ўдалеч
у мыльны шале
эскадрон.
Мой таварыш
націскае павады,
і ліхая раптам куля,
да бяды.
Шыбанула,
расчапіла галаву.
На памятую
зваліўся ён траву.
Мчацца далей,
коні мчацца.
Звон страмён.
Мчыцца далей,
у мыльным шале
эскадрон.

М. ХВЕДАРОВІЧ.

Віцебскі глядач шчыра вітае БДТ1.

Нядаўна Віцебск вітаў пачатак працы ў гэтым годзе БДТ1. У сваіх прывітаньнях прадстаўнікі партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый выказвалі ўпэўненасьць, што наш тэатр зможа выканаць пастаўленыя перад ім задачы і жадалі посьпеху.

Прайшло мала часу, каб падводзіць якія-небудзь падрахункі, але і за гэты кароткі тэрмін становіцца ясна, што надзеі і пажаданьні збываюцца. Ужо першыя пастаноўкі далі поўнае здаволеньне гледачу, паказаўшы, у яркіх вобразах мінулае Беларусі. («Кастусь Каліноўскі», «Каваль Ваявода», «Панскі Гайдук»), **яе рэвалюцыйнае мінулае, так цесна зьвязанае з юбілеем дзесяцігодзьдзя Вялікага Кастрычніка.**

Масавы глядач Віцебску даведаўся, што і на Беларусі ў часе царызму былі барацьбіты-рэвалюцыянэры за сацыяльна - нацыянальнае вызваленьне працоўнага беларускага народу, і зацікавіўся рэвалюцыйным мінулым сваёй краіны; і ў гэтай справе значна дапамаглі паказаныя пастаноўкі.

Вялікую ўвагу прыцягваюць да сябе п'есы з сучаснага жыцьця («Кар'ра Брызгаліна»),у якіх на фоне беларускага быту даюцца вобразы і падзеі будаўніцтва новага жыцьця, а адмікатаксамаўныя тыпы бюракратаў у р'ерыстае перашкаджаючых гэтаму будаўніцтву.

Высьвятленьне нацыянальных бытавых асаблівасьцяй надта важна ў нас для падняцьця беларускай культуры, і ў гэтым напрамку БДТ1 робіць вялікую справу, даючы гледачу рэвалюцыю быту (партыя, камсамол, піянэры).

Льготныя білеты для сяброў саюзаў, спэцыяльныя дні (чацьвер) студэнцкіх пастановак, намечаныя выезды ў рабочыя клюбы і спэцыяльныя пастаноўкі для вучняў сямігодак—паказваюць, што наш тэатр хоча трымаць цесную сувязь з працоўнымі масамі, што ён сваю працу будуе на яднаньні з гледачом, што ён не адрываецца ад жыцьця.

Трэба застанавіцца яшчэ і на тым прыемным уражаньні, якое робяць пастаноўкі як з боку тэхнікі, так і з боку ігры. Тыя, хто бачыў у 1924 г. пастаноўкі БДТ1, з радасьцю сьцьвярджаюць, што тэатр вырас у сваім самаўдасканаленьні, што ён працуе над сабою.

І таму мы маем жывыя тыпы на сцэне, тэхніку выкананьня і ігры, мастацкае афармленьне вобразу, скампанаванасьць масавых зьяў і наогул пастаноўку, якая захапляе гледача, робіць удзельнікам п'есы, прымушае перажываць тое, што робіцца на сцэне.

Віцебскі глядач шчыра вітае працу БДТ1.

Я. Цікавы.

Беларускія мастацкія выстаўкі.

НА ВЫСТАЎЦЫ НАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦЯЙ СССР.

Беларускі аддзел на мастацкай выстаўцы нацыянальнасьцяй СССР у Маскве ўжо арганізаваны і мае быць адчынены 6 лістапада. На гэту выстаўку прадстаўлена беларускае саматужнае сялянскае мастацтва, якое спэцыяльна для гэтай мэты зьбіралася па акругах БССР. Мастацтва гэта цалкам яшчэ знаходзіцца пад уплывам старых традыцый, але паступова пачынаюць прасякаць у народнае мастацтва плыні новага жыцьця, напрыклад, зьявіліся ўзоры сярпа і молата, чырвонаармейскага шлема.

Каб даць поўны малюнак народнага мастацтва, на выстаўку паслана некалькі слуцкіх паясоў і іншых прадметаў музэйнага мастацтва з Беларускага Дзяржаўнага Музэю.

Апроч таго, у беларускім аддзеле выстаўкі нацыянальнасьцяй прадстаўлена наша жывапісь, і выдавецка-літаратурная справа. Музыка прадстаўлена рукапісна-нотнай літаратурай, а таксама і ўсёй музычнай літаратурай, якая да гэтага часу выдана ў БССР. На выстаўцы таксама ёсьць куток нашай клюбнай і школьнай творчасьці. Асобнае месца ў беларускім аддзеле займае архітэктурны аддзел, дзе ў выглядзе плянаў, макетаў і фатаграфій прадстаўлены малюнак нашага будаўніцтва за 10 год.

Тэатральнае мастацтва прадстаўлена лепшымі макетамі і эскізнымі пастаноўкамі чатырох тэатраў БССР.

Народны аддзел выстаўкі памяшчаецца Няскучным Садзе, а чатыры мастацтвы (жывапісь, разьбярства, графіка і архітэктура)—у выставачным памяшканьні Футэмаса на Мясьніцкай вуліцы.

Пры гэтай выстаўцы Дзяржаўная Акадэмія Мастацкіх Навук, сумесна з Наркамасьветы БССР, наладжваюць вялікія нацыянальныя вечары, на якіх будуць выступаць з дакладамі аб стане беларускай літаратуры і мастацтва, а таксама выступяць пісьменьнікі ўсіх нашых літаратурных груповак („Маладняк", „Узвышша", „Юнгер Арбайтэр", „Камуна і Праблёск"). Робяцца захады, каб на гэты вечар выехаў цалкам студыйны хор пры Наркамасьвеце.

2-АЯ ЎСЕБЕЛАР. ВЫСТАЎКА.

6 лістапада ў Менску адчыняецца наладжаная Наркамасьветы, па прапанове Цэнтральнай Юбілейнай Каміі пры ЦВК БССР, 2-я ўсебеларуская мастацкая выстаўка. На гэту выстаўку ўжо атрыманы экспанаты з усіх канцоў БССР. Віцебск у асобе мастацкага тэхнікуму і яго выкладчыкаў бярэ шырокі ўдзел у выстаўцы. Таксама сабрана шмат экспанатаў сярод жывапісцаў і граф'ка-беларусаў, якія вучацца ў Маскве і Ленінградзе і ўвесь час трымаюць сувязь з Беларусьсю.

У журы выстаўкі Наркамасьветы вызначыў працаўнікоў Цэнтральнай Юбілейнай Каміі, Дзяржаўных Музэяў, аб'яднаньняў мастакоў і г. д.

У добры час!

(Да паездкі Беларускага студыйнага хору ў Маскву).

У дні кастрычнікавых сьвят у Маскве адчыняецца выстаўка мастацтва народнасьцяў СССР. Ад Савецкай Беларусі будуць пасланы туды працы розных мастакоў, тэатральныя макеты, мастацкія вырабы сялянства і г. д.; паедуць туды некаторыя пісьменьнікі і, як зазначалася ў газэтах, Беларускі студыйны хор.

Пасылку гэтага хору, які зьявіўся, можна сказаць, намесьнікам усім вядомага, маючага свае гістарычныя заслугі, хору Ул. Тэраўскага, бязумоўна, трэба вітаць.Сваю-ж справу, можна сьмела спадзявацца, выканае ён ня дрэнна.

Беларускія песьні Маскве ўжо вядомы. І прымае яна іх з вялікай прыхільнасьцю. Варта толькі ўспомніць 1923 г., Усесаюзную с.-г. выстаўку. Выяжджаў туды на гэту выстаўку і БДТ1 разам са сваім хорам. Прабылі там роўна месяц. І за гэты месяц было пастаўлена там усяго 8 спэктакляў, а канцэртаў хор даў—больш як 30. Гарача прымалі яго і ў рабочых клюбах, і ва ўнівэрсытэтах, і на грамафоннай фабрыцы (напеў плястынак), і шматтысячныя грамады працоўных на адкрытым паветры („Нескучный сад").

Першы раз загаварыла тады аб беларускай песьні і цэнтральная прэса. Зацікавіліся тады гэтай песьняй і выдатныя маскоўскія кампазытары, пасьля дэманстраваньня яе хорам Ул. Тэраўскага у ГІМН'е (Государственный Институт Музыкальных Наук) на спэцыяльным пасяджэньні,—і з таго часу пачалі яны яе апрацоўваць.

Значыцца, цяпер мы сьмела і з гонарам можам у сэрцы рабоча-сялянскае дзяржавы —Чырвонай Маскве магутным „Клічам да Працы" на радыё-хвалях абвясьціць усяму сьвету, што беларуская песьня, над якой яшчэ так нядаўна сьмяяліся, у Чырвонай Краіне атрымала поўнае права на іспаваньне і вядомай цяпер стала ня толькі на ўсіх кутках Вялікага Саюзу, а і з вялікай зацікаўленасьцю прымаецца ў заходня-эўрапейскіх краінах.

К. П-кі.

Дасягненьні ў працы краязнаўчых арганізацый.

(Да ўсебеларускай краязнаўчай нарады).

У навуковай галіне галоўным заданьнем краязнаўчых арганізацый на мясцох, паводле пастаноў І і ІІ ўсебеларускіх краязнаўчых зьездаў, павінна быць вывучэньне і дасьледваньне раёнаў.

Дзеля таго, каб даць магчымасьць краязнаўчым арганізацыям на мясцох азнаёміцца з мэтадамі і формамі працы, Цэнтральнае Бюро Краязнаўства стала ў 1925 г. на шлях выданьня свайго спэцыяльнага часопісу „Наш Край", у якім друкуюцца ўвесь час інструкцыйныя і мэтадычныя ўказаньні спэцыялістых па дасьледваньні і вывучэньні таго ці іншага пытаньня, а таксама зьмяшчаюцца практычныя працы краязнаўцаў. Усяго за два гады выдрукавана 72 экз. інструкцый, анкет і праграм па розных галінах краязнаўчай працы. Як можна бачыць, у гэтым напрамку было зроблена шмат.

Каб паказаць прыклад, як рабіць вывучэньне раёну, ЦБК выдзеліла адзін раён Бабруйскай акругі, Асіпавіцкі, як ударны, і зьвярнула на вывучэньне яго асаблівую ўвагу. Акруговыя таварыствы краязнаўства таксама праводзяць вывучэньне выдзеленых імі раёнаў.

Трэба адзначыць, што, дзякуючы гэтым мерапрыемствам, а таксама належнаму кіраўніцтву з боку некаторых акруговых краязнаўчых таварыстваў, сярод раённых таварыстваўкраязнаўства вызначыліся такія, якія маюць паўныя дасягненьні ў галіне вытворчай дзейнасьці: зроблена вывучэньне і апісаньне тых ці іншых вёсак, сельсаветаў, мясцовай прамысловасьці, вядзецца апісаньне прыродных зьяў, вывучэньне багацьцяў і г. д.

Канкрэтным вынікам гэтай працы зьяўляецца арганізацыя некаторымі раённымі ікраязнаўчымі таварыствамі краязнаўчых музэяў. Справа па арганізацыі мясцовых краязнаўчых музэяў асабліва павінна шырока разгарнуцца ў сувязі з сьвятам дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Каштоўнейшыя экспанаты мясцовых выставак (дыяграмы, картаграмы, плякаты, даклады і інш.), якія адбіваюць дасягненьні нашай гаспадаркі, прамысловасьці і культуры к 10 гадавіне Кастрычніка, павінны быць абавязкова захаваны і стаць падвалінай у заснаваньні мясцовага музэю. Гэта неадкладная задача ўсёй нашай грамадзкасьці на мясцох. У гэтым кірунку Ц.Кам. БССР па правядзеньні 10 гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі і Ц. Б. Краязнаўства месцам дадзены належныя ўказаньні. Краязнаўчым арганізацыям сумесна з мясцовымі камісіямі па правядзеньні сьвяткаваньня неабходна зрабіць усё дзеля ажыцьцяўленьня гэтага заданьня. Яшчэ больш значную працу робяць мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі ў справе дапамогі навуковым установам БССР, якія вядуць дасьледваньне ці вывучэньне краіны.

За апошнія два гады краязнаўчымі арганізацыямі дасланы Інбелкульту наступныя матар'ялы: слоўнікавай камісіі для ўкладаньня слоўніка жывой мовы 156.658 картак-слоў, апрача 42.000 картак-слоў, дасланых акруговым таварыствам, фальклёрнай камісіі 11.804 экзэмпляраў вуснай народнай творчасьці (песень, казак, загадак, прыказак і інш.), зарысовак і ўзораў тканін—197, іншых розных рэчаў—757.

Апрача гэтага, праводзілася анкетнае вывучэньне па заданьнях сэкцый ці камісій ІБК тых ці іншых пытаньняў. За гэты час праводзілася вывучэньне бюджэту, часу селяніна, хатніх рамёстваў, каапэрацыйнага апарату, звычаёвага права, манаграфічнае апісаньне паселішч. Усяго па гэтых пытаньнях дасланы краязнаўчымі арганізацыямі 490 запоўненых анкет.

Зараз праводзіцца выпраўленьне націскаў у мясцовых назвах паселішч і самых назваў для геаграфічнай карты прамысловасьці па заданьнях Картаграфічнага Бюро ВСНГ, вывучэньне і дасьледваньне асаблівасьцяй народных гутарак паводле праграм праф. Бузука і С. Некрашэвіча, укладаньне археолёгічнай карты кожнай акругі, вывучэньне санітарна-бытавога дасьледваньня вёскі інш.

На працягу двох год вядуцца шмат якімі раённымі краязнаўчымі арганізацыямі сталыя мэтэоролёгічныя назіраньні, каторыя, як сьведчыць Заг. Мэтстанцый НКЗ, вядуцца здавальняюча і значна дапамагаюць справе вывучэньня клімату краіны.

У сувязі з рэарганізацыяй Інбелкульту, а таксама адчыненьнем Навукова-Дасьледчага Інстытуту мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі, як дапаможныя інстытуцыі ў дасьледваньні тых ці іншых пытаньняў, набываюць яшчэ большае значэньне.

Зараз ёсьць магчымасьць папоўніць той прабел у выданьні інструкцыйна-мэтадычнага матар'ялу па эканамічнай галіне, які назіраўся да апошняга часу. Аддзел Прыроды і Гаспадаркі Інбелкульту і Інв. Д. І. павінны прысьці на дапамогу краязнаўчым арганізацыям у гэтай галіне.

Музыка ў „Апраметнай".

Гісторык музыкі, сочучы за тым цікавым працэсам утварэньня беларускае мастацкае музыкі, які распачаўся пасьля Кастрычнікавае рэвалюцыі (і дзякуючы толькі ёй) і адбіваецца на нашых вачох, з вялікаю цікавасьцю павінен адносіцца да кожнага новага твору ў гэтай галіне. А калі новы твор мае музычную вартасьць, дык радасна робіцца, што скарбніца беларускае мастацкае музыкі павялічваецца. Гэты выпадак мы і маем перад сабой у музыцы да драмы В. Шашалевіча „Апраметная".

Музыка да „Апраметнай" напісана па заказе БДТ 2 двума кампазытарамі: большасьць яе—вядомым расейскім кампазытарам А. Т. Грачанінавым, а №№ 21, 22, 23 і 47-ы па партытуры—дырыжэрам БДТ 2 І. А. Гітгарцам. Агульнае ўражаньне ад музыкі абодвых кампазытараў надзвычайна прыемнае. Яна ўся простая, ясная, зразумелая і бадай што ўсюды добра пасуе з тымі настроямі, выклікнуць якія мае на мэце п'еса. Зразумела, я зусім не датыкаюся вартасьці гэтых настрояў, зьместу п'есы і яе ідэалёгічнага напрамку.

Я бяру музыку як музыку, саму па сабе, з боку яе чыста музычнае вартасьці.

Сьпаміж паасобных месц у музыцы „Апраметнай" павінен адзначыць наступныя. Надзвычайна прыгожа гучыць струнны квартэт, які акампануе лерніку. Інструмантоўка тут цудоўная, а арганны пункт на квінце вельмі добра нагадвае леру. Дый мэлёдыя зроблена мастацкі, і выконвае яе лернік вельмі характэрна і „этнаграфічна". Таксама прыгожы струнны квартэт і ў пачатку першай дзеі, калі дзеці сьпяць (перад зьяўленьнем ведзьм). Абодвы гэтыя месцы вытрыманы ў чыста беларускім стылі.

Музыку да дуэту (слоўнага) Янкі і Алёнкі (у 3-яй дзеі) І. А. Гітгарц пабудаваў на вельмі прыгожай тэме народнай песьні. Тэма гэтая напісана ў міноры, але потым кампазытар модулюе ў мажор (Fis dur), у якім выкладае тую-ж тэму. Ня ведаю, ці правільна зрабіў аўтар музыкі, бо ў мажоры тэма страціла свой характар і нацыянальны колёрыт. Можа гэта патрабавалася „мажорнымі" марамі Янкі і Алёнкі аб вызваленьні Беларусі? Можа быць, ня буду спрачацца. Прыгожа напісаны хорык паланёных ведзьмаком багатыроў, якія будуюць яму „крышталёвы палац". Добра гучыць і марш багатыроў.

Але ёсьць у музыцы і адмоўныя бакі. Галоўны з іх той, што нацыянальны беларускі колёрыт вытрыманы далёка ня ўсюды, а некаторыя месцы нават зьдзіўляюць слухача сваім характарам. Калі ведзьмы адносяць заснуўшую Алёнку, музыка іграе нешта на ўзор хаўтурнага маршу, тэма якога ўзята ў Шуберта (з 4-га квартэту d—moll, andante con moto). Калі „Чорная Лілея танцуе перад Янкам, дык музыка нагадвае не беларускі скок, а зусім гішпанскае bolero, і не хапае толькі кастаньет. Няма нічога беларускага і ў музыцы ў часе клятвы Янкі з таварышамі па мячох, хоць сама сабе музыка ў гэтым месцы (Гітгарца) бязумоўна добра зроблена. Трэба сказаць і тое, што музыка Грэчанінава наогул вельмі небагатая тэмамі. Усе яны малевечкія, і аўтар адну тэму пераважае шмат разоў на працягу ўсяе п'есы. Але ўсе гэтыя хібы неяк ня псуюць агульнага ўражаньня, бо музыка абодвых аўтараў усё-ж ткі сама па сабе добрая, прыгожая і цікавая.

Што тычыцца выкананьня музыкі, дык рашуча павінен адзначыць, што дырыжэр Гітгарц вядзе свой невялічкі аркестр дасканала. На працягу ўсяе п'есы мы чуем нейкі прыгожы, крыху цьмяны і як быццам аксамітны тэмбр аркестру. Зразумела, у даным выпадку маюць значэньне і іншыя фактары, як прыкрыцьце аркестру, належная інструмантоўка, частыя con sordino у смычковых. Ёсьць, аднак, і ў выкананьні партытуры адна немалая хіба. Гэтая хіба—адсутнасьць некаторых інструмантаў, асабліва габою і 2-га клярнэту, якія патрабуюцца партытурай. Адсюль утвараюцца музычныя „дзіркі", пустата. Напрыклад, у памянёнай прыгожай тэме Гітгарца замест габою іграе скрыпка, а клярнэту, які контрапунктуе з габоем, зусім няма, і срыпка застаецца сіратой. Адсутнасьць габою асабліва адчуваецца ў нумарох Гітгарца, бо Грэчанінаў меней ужывае ў сваёй партытуры гэты інструмант, дый ужывае яго не як салістага, а ў tutti і forlissimo, дзе ён мала прыкметны. Гэты недахоп інструмантаў павінен быць бязумоўна выпраўлены, бо дзяржаўны тэатр павінен быць узоравым тэатрам.

А ўвогуле—музыка да „Апраметнай" ёсьць уклад у скарбніцу беларускае мастацкае музыкі і ўклад зусім ня дрэнны. І БДТ2 уніша мусіць і сваю добрую старонку ў гісторыю беларускае музыкі, як зрабіў гэта БДТ1.

Ю. Дрэйзін

Зьм. Прышчэпаў.

Сельская гаспадарка Прусіі і Даніі ў параўнаньні з беларускай*).

Вялізарны лік бэкону цяпер вывозіць Данія, а калісь яна вывозіла, галоўным чынам, толькі жывых сьвіней. Справа сьвінагадоўлі ў іх надзвычайна арыгінальна арганізавана. У іх паміж гаспадарамі праца па сьвінагадоўлі падзелена на падставе камэрцыйнага разрахунку так, што адны гаспадаркі гадуюць толькі племянны матар'ял, другія племянны матар'ял маюць са сваёй дацкай сьвіньнёй, а трэція бяруць гэты прыплод і вырашчваюць на продаж галоўным чынам на бэконныя фабрыкі. Дзякуючы такой арганізацыі справы, там сьвіньню дзеля бэкону гадуюць толькі восем месяцаў і пагэтаму нават дробныя гаспадаркі гэктараў у пяць маюць магчымасьць прадаваць звыш 20 галоў сьвіней у год і на гэтым зарабляюць каля тысячы рублёў у год. А ў нас пры экстэнсыўнай сьвінагадоўлі селянін замест 8-мі месяцаў гадуе сьвіньню ў сярэднім гады 4, а выгадуе вялічынёй ня больш кошкі, у якой адно рыла важыць больш сьвіньні. Наглядзім, які вываз жывых сьвіней і бэкону праходзіць з Даніі.

Гады.	Вываз жывых сьвіней.	Гады.	Вываз бэкону ў пудах.
1880-84 г.	289.400	1895-99	3.825.987
1896-900	0	1910-14	7.889.725
1909-13	0	1918	169.142
1914-18	0	1922-23	9.106.130
1920-24	71.200		

Ужо даўно Данія кінула вывазіць жывых сьвіней. Уся прадукцыя сьвініны перапрацоўваецца і вывозіцца ў якасьці бэкону. Пры гэтым узрост бэкону дае па гадох надзвычайна хуткі ўзрост. Асабліва яскравым прыкладам умеласьці арганізаваць справу зьяўляецца параўнаньне 1918 году з 1922-23 годам, калі з **169.142 пуд.** экспарт адразу падскочыў да **9.106.130 пуд.** У працягу якіх-небудзь чатырох год з мізэрнай лічбы экспарту далёка перасягнулі даваенны экспарт. Адразу бачыш, што каб у такі кароткі тэрмін дабіцца такога вывазу патрэбен глыбокі каапэрацыйны навык і прыстасаваньне да культурнага вядзеньня гаспадаркі з боку сялянства і буйных абшарнікаў. Калі мы нашаму сялянству прышчэпім такія каапэрацыйныя і культурныя навыкі, ад гэтага тэмп арганізацыі ў нас сацыялістычнага земляробства толькі павялічыцца. Праўда, у нас цяпер запатрабаваньне на племянных сьвіней з боку сялянства з кожным годам пашыраецца. Намі арганізавана сетка дзяржаўных сьвінных заводаў і адчыняюцца выхавальнікі-распаўсюджвацелі. Практыка паказала, што ўсёткі племянным матар'ялам мы сялянства не здавальняем, і трэба, памойму, задачу паставіць так, каб кожны саўхоз і калхоз, асабліва ў раёнах таварнае сьвінагадоўлі, меў племянных сьвіней. Пры хуткасьпеласьці сьвіньні мы маем магчымасьць у некалькі год завесьці і пашырыць таварную сьвінагадоўлю ў сялянскіх гаспадарках і гэтым самым пашырыць прыбытковасьць гаспадаркі. Мне здаецца, што працу ў гэтым напрамку неабходна весьці па ўсёй Беларусі, але-ж адначасова з гэтым неабходна вызначыць раёны таварнай сьвінагадоўлі і павесьці гнёздавым парадкам працу, каб там увесьці племянную сьвінагадоўлю. Перад тым, як распаўсюджваць племянны матар'ял, нам неабходна правесьці і належную працу сярод сялянства па ўмелай пастаноўцы карменьня сьвіней, бо калі наш селянін племянных сьвіней перавядзе ў надворныя, як гэта ён робіць са сваімі сьвіньнямі, дык яны напэўна падохнуць. Каб разводзіць «культурных» сьвіней, калі так дазваляецца сказаць, селянін павінен падумаць і аб культурнасьці сваёй гаспадаркі, бо сам ён павінен навучыцца пановаму гаспадарыць. Датчане так хутка пашырылі экспарт бэкону таму, што яны ўмеюць арганізоўваць і вядуць культурную гаспадарку.

Калі цяпер возьмем птушніцтва па экспарту, дык нас таксама зьдзівіць каласальная таварнасьць гэтай галіны сельскае гаспадаркі. Так, вавозілася яек па ліку скрынак (у кожную скрынку зьмяшчаецца 20 яек).

1895-99 г.	. . . 207,6	(тысяч).
1910-14 г.	. . . 402,4	„
1918	. . . 327,2	„
1921-23	. . . 718,8	„

І па вывазу яек Данія таксама перавысіла даваенны экспарт. Мне прышлося самому бываць у цэлым шэрагу дробных сялянскіх гаспадарак і бачыць, як шмат яны трымаюць курэй. У аднаго селяніна, які мае 5 гэктараў зямлі, у гаспадарцы было 70 курэй, з якіх кожная ў год нясе 180 яек. Значыць, усяго будзе 180×70=12.600 яек, за якія ён атрымоўвае прыблізна 360 руб. у год. Такі прыбытак адпавядае гадавой пэнсіі нашага вясковага настаўніка. А наш селянін пакуль што амаль ніякага прыбытку не атрымлівае. А між іншым пры нашым аграрным беспрацоўі і пры нашых умовах ёсьць шырокія магчымасьці разьвіць птушкаводзтва і праз гэта значна пашырыць прыбытак нашых сялянскіх гаспадарак. Пры нашай вазёрнасьці ў нас магчыма вырашчваць на продаж гусей. У даваенны час Беларусь вывозіла шмат гусей, а цяпер і гэта справа заглохла. Тлумачыцца гэта нашай нядбайнасьцю і няўмеласьцю знаходзіць заробак у самой сельскай гаспадарцы. Як-небудзь нам прыдзецца паклапаціцца аб тым, каб завесьці племянных птушак, больш зацікавіць гэтай справай асабліва сялянак, наладзіць арганізацыю птушніцкай каапэрацыі.

Як бачым, у Даніі разьвіваюць малочную рагатую жывёлу, сьвіней, птушак, якраз на разьвіцьцё якіх і мы трымалі курс і цяпер у гэтым напрамку рэарганізуем гаспадарку.

Характэрна, што коняў у дробных гаспадарках датчане трымаюць невялікіх. А ў нас некаторыя сяляне стараюцца завесьці такога вялікага каня, каб ён адзін за зіму ўсё сена пасў; з такім канём каровам і авечкам хоць з голаду дохні, але-ж затое конь вялікі.

Вельмі цікавай для нас зьяўляецца арганізацыя аграпамічнай дапамогі сельскай гаспадарцы. Там справа пастаўлена так, што яны дабіваюцца таго, каб мець аграпамічна падрыхтаванага гаспадара, а спэцыялісты толькі дае кансультацыю па тых ці іншых пытаньнях. А ў нас на ролю спэцыялістага склаўся такі погляд, што, скажам, агравом павінен сам непасрэдна абслугоўваць амаль што ня кожную сялянскую гаспадарку. Калі па такому шляху ісьці, дык нам падабіцца надзвычайна вялікі штат, на ўтрыманьне якога патрэбны будуць каласальныя сродкі, ды і самім аграномам надзвычайна цяжка будзе справіцца з працай, калі толькі само сялянства ня будзе падрыхтавана ў аграпамічным напрамку.

Як ва Ўсходняй Прусіі, так і ў Даніі галоўнымі сродкамі аграпамічнай дапамогі сельскай гаспадарцы зьяўляюцца сельска-гаспадарчыя школы (сярэднія), дзе прыблізна тэрмін выхаваньня два гады. Самі настаўнікі тых школ зьяўляюцца адначасова і інспэктарамі па розных галінах сельскай гаспадаркі ў тым раёне, які абслугоўвае школу. Шчыльная сувязь паміж практычнай працай і навучальнай установай. Там ніжэйшая і сярэдняя сельска-гаспадарчая школа падрыхтоўвае ня чыноўнікаў аграномаў, а самых гаспадароў. А ў нас якраз наадварот: вучні ня толькі вышэйшых і сярэдніх школ, а і з школ вясковай моладзі ніводзін ня толькі ня хоча, але-ж і ня думае ісьці працаваць у сельскую гаспадарку. Да гэтага часу захаваліся традыцыі і погляд старых царскіх часоў, што школа рыхтуе толькі чыноўнікаў, і ўсё гэта, бязумоўна, перашкаджае прасоўваньню агранамічных ведаў у самыя гушчы сялянства. Апрача таго, складаецца такі настрой, што кожны чалавек з асьветай імкнецца кінуць вёску і ўцячы ў горад на заработкі. А мы павінны цяпер якраз наадварот ставіць пытаньне: рэарганізацыяй і палепшаньнем сельскай гаспадаркі падняць яе прыбытковасьць і, такім чынам, знайсьці заработкі ў самой вёсцы. Асабліва такое пытаньне пара ставіць перад нашай вясковай моладзьдзю, якая цяпер пагалоўна імкнецца ў горад і мала цікавіцца праблемамі рэарганізацыі сельскае гаспадаркі.

У нашых умовах цяпер пара ўзяць курс на аграпамічна падрыхтаванага селяніна-гаспадара і дзеля гэтага ма' быць прыдзецца рэарганізаваць сыстэму сельска-гаспадарчай асьветы а таксама і нашы агранамічныя курсы, з тым, каб, скончыўшы іх, селянін быў ня толькі з'агітаваны пановаму весьці сельскую гаспадарку, але ўмеў практычна пановаму будаваць сельскую гаспадарку. Раённыя агранамічныя пункты неабходна будзе так будаваць і абсталёўваць, каб яны былі на зімовы перыяд дзеля сялян гаспадароў сельска гаспадарчымі школамі. Мы цяпер маем дастатковы лік спэцыялістых у кожным раёне дзеля таго, каб у кожным раёне была такая зімовая школа дзеля сялян. Такі парадак агранамічнай падрыхтоўкі сялян я высоўваю ў парадку абгаварэньня. Калі рэарганізаваць школы сялянскае моладзі, прыстасаваць агранамічныя пункты, дык мы будзем мець па БССР досыць густую сетку зімовых школ, якая-б здаволіла нашы і сялянскія запатрабаваньні ў аграпамічнай падрыхтоўцы вёскі. Ад гэтага тэмп нашага будаўніцтва на вёсцы толькі павялічыцца і якасьць агранамічнае працы толькі палепшыцца.

Ёсьць чаму нам навучыцца ва Ўсходняй Прусіі і Даніі і ў галіне будаўніцтва сельска-гаспадарчай каапэрацыі. У іх там і ў нізох сельска-гаспадарчая каапэрацыя будуецца такім чынам (возьмем малочнае таварыства). Пайшчыкі прымаюць статут, абіраюць прэзыдыум, замест нашага праўленьня, які праводзіць працу дарэмна; у малочную прызначаецца дырэктар, абавязкова спэцыялісты, які фактычна і вядзе ўсю справу. Прэзыдыум толькі перыядычна рэвізуе дзейнасьць дырэктара. Пры такім парадку накладныя выдаткі невялікія і справа добра пастаўлена. А ў нас як раз наадварот. Шмат грошай каштуе ўтрыманьне самага каапэрацыйнага апарату, бо амаль што ўвесь абраны пэрсанал аплачваецца, ды і людзі туды часта пападаюць такія, якія з каапэрацыйным будаўніцтвам не знаёмы і пагэтаму разам з платнымі сябрамі праўленьня прыходзіцца нанімаць спэцыялістых, ці людзей знаёмых з працай каапэрацыі. У выніку гэтага ў нас, у параўнаньні з замежамі, двайны платны апарат; ён выклікае досыць вялікія накладныя выдаткі, з якімі каапэрацыя цяжка спраўляецца, і яна пападае ў дэфіцыт і правальваецца.

Ня шкодзіла-б нам правесьці ў некалькіх мясцох заходне-эўрапейскую каапэрацыйную практыку. Такі парадак ніколькі ня будзе перашкаджаць нашаму каапэрацыйнаму будаўніцтву, а толькі палепшыць яго. Накладныя выдаткі ў каапэрацыі пара скараціць, апарат зрабіць гібкім і паставіць людзей, якія ведаюць, як весьці справу і даць гэтым людзям больш адказнасьці ў працы. Пры добрай пастаноўцы каапэрацыйнай працы сяляне будуць мець выгаду ад каапэрацыі і гэтым, бязумоўна, будзе выклікана зацікаўленасьць насельніцтва каапэрацыяй, і каапэраваньне вёскі толькі пашырыцца.

Таксама і праца па культуры балот зьяўляецца для нас карыснай, асабліва цяпер, калі ў нас па Беларусі разгортваюцца мэліярацыйныя мерапрыемствы. У іх там мэліярацыйная палітыка праводзіцца па такому прынцыпу: дзяржава асыгноўвае спэцыяльны доўгатэрміновы мэліярацыйны крэдыт, за кошт якога скупляюцца ў прыватных асоб балотныя масывы, на якіх пасьля гэтага праводзіцца асушка і культуртэхніка. Падрыхтоўка балота дзеля арганізацыі на ім сельскае гаспадаркі абыходзіцца ў сярэднім 450 руб. на гэктар. Як бачыце, каштуе дорага. Пасьля прыстасаваньня такім чынам балотныя землі здаюцца ў арэнднае карыстаньне сялян ці прадаюцца. У большасьці практыкуецца вечная, альбо доўгатэрміновая арэнда зямлі. Становішча сялян калёністых у большасьці кепскае, бо прыходзіцца шмат грошай плаціць за арэнду зямлі.

Практыка Заходняе Эўропы кажа нам аб тым, што на Беларусі таксама магчыма разгарнуць працу па калёнізацыі (васяленьню) балот. У нас ёсьць шмат вялізарных балотных масываў, у нас і досыць вялікае запатрабаваньне на зямлю. Калі мы прымем пад увагу, што прыватная ўласнасьць на зямлю скасавана і такім чынам за зямлю нічога ня трэба плаціць,—прыстасаваньне нашых балот пад сельскую гаспадарку значна палягчаецца, бо нам патрэбны сродкі толькі на мэліярацыйныя мерапрыемствы. Апрача таго, ва Ўсходняй Прусіі і Даніі сама дзяржава на мэліярацыю адпушчае толькі крэдыт і ніводнага рубля беззваротных не дае. А ў нас якраз наадварот—значная частка выдаткаў па мэліярацыю зьяўляецца беззваротнай. Усё гэта дае нам упэўненасьць і рэальныя магчымасьці, каб пачаць шырокую працу па падрыхтоўцы балот дзеля сельскае гаспадаркі і пачаць на іх шырокую калёнізацыю і гэтым самым зьнішчыць зямельны голад на Беларусі. Няўдобных і неабжытых земель на Беларусі ня будзе.

Такім чынам, па кожнай галіне нам ёсьць што пераняць карыснае ад сельскае гаспадаркі Заходняй Эўропы і перанесьці ў практыку нашай працы па сельскай гаспадарцы.

(*КАНЕЦ*).

*) Гл. „С. Б" №№ 239—241.

Ад лютага да Кастрычніка.

(Хроніка гістарычных падзей).

10-23 кастрычніка.

— **У Петраградзе адбылося пасяджэньне ЦК РСДРП(б) з удзелам ЛЕНІНА для вырашэньня пытаньня аб узброеным паўстаньні. Большасьцю ўсіх галасоў проці двух прынята рэзалюцыя ЛЕНІНА аб пастаноўцы ўзброеннага паўстаньня ў парадак дня. Абрана Паліт. Бюро з 7 чалавек.**

— У Маскве на аб'яднаным пасяджэньні саветаў Р і СД абгаварвалася пытаньне аб статуце Чырвонай гвардыі. Прэзыдыум Савету Салд. Дэп. (абарончаскі) заявіў, што салдацкая секцыя яшчэ не закончыла абгаварэньня пытаньня аб Чырвонай гвардыі і настайваў на вырашэньні гэтага пытаньня выключна Сав. Салд. Дэп. Большасьцю 330 галоў супроць 108, пя прымаўшых удзелу ў галасаваньні (фракцыя меншавікоў і с.-р.) прынята рэзалюцыя, запрапанаваная фракцыяй б-коў. Рэзалюцыя знаходзіць, „што вырашэньне пытаньня аб статуце Чырвонай гвардыі ня церпіць адкладу, што яно павінна быць прынята супольна рабочымі і салдатамі; канчатковае вырашэньне пытаньня адкладзена да 17 кастрычніка, каб даць магчымасьць Сав. Салд. Дэп. папярэдам абгаварыць пытаньне.

— Адбылася другая нарада „предпарламента", на якой заслуханы паведамленьні ўраду аб абароне краіны (Церахоўскі, Вэрдэрэўскі, Керанскі),

— У Маскоўскім горным раёне (Данбас) распачалася ўсеагульная забастоўка горнарабочых, патрабуючых вываду казачых войск.

— У „Рабочем Пути" пад загалоўкам „Истязания в тюрмах Керанскага" надрукаваны ліст у рэдакцыю с-д. інтэрнацыяналіста І. Люблінскага, які з 27 чэрвеня знаходзіўся ў турме ў Сосьніцах, дзе яго каталі (28 ран, выбіты зубы, выкручаны пальцы, ад удараў ботам зьлезла скура; каб ня крычаў—здушана горла і паламаны гарлавы храсток), каб вынытаць, хто яшчэ спачувае Леніну ў Сосьніцах.

— Пам. губэрскага камісара, які вярнуўся з паездкі па Валыні, у дакладзе гаворыць, што Валынь знаходзіцца ў стане поўнай анархіі. У многіх паветах ідзе поўнае зьнішчэньне лясоў і захват прыватнаўласьніцкіх зямель. У Старакастантынаўскім павеце бальшавікі захапілі ў свае рукі ўладу.

— ПТА паведамляе, што ў распараджэньне саратаўскага губ. камісара час. ураду пасланы тры палкі казакоў „для барацьбы з непарадкамі ў губэрні".

— У Петраградзе адбылася 4-я агульнагарадзкая канфэрэнцыя фабр.-зав. камітэтаў.

— Тэлеграма з Кіева паведамляе, што усеукраінскі зьезд вольнага казацтва, які адбыўся ў Чыгірыне, запрапанаваў ген. Скарападзкаму годнасьць атамана вольнага казацтва.

11—24 кастрычніка.

— **У Петраградзе адчыніўся зьезд Саветаў Раб. і Салд. Дэп.** Паўночнай вобласьці, скліканы па ініцыятыве Абласнога к-ту арміі, флёту і рабочых Фінляндыі. Зьезд адчыніў Антонаў (Аўсеенка). Старшынёй зьезду абраны Н. Крыленка. Пераважная большасьць дэлегатаў зьезду—бальшавікі.

— Агульны сход рабочых Пуцілаўскага заводу аднагалосна прыняў рэзалюцыю б-коў з патрабаваньнем перадачы ўлады Саветам, узбраеньня рабочых і г. д. Сход пратэстуе супроць вываду петраградзкага гарнізону.

Аналёгічныя рэзалюцыі вынесены агульным сходам салдат 1-й аўтамабільнай зап. роты ў Петраградзе, 4000 мітынгам у Колпіне і сходам 12 перавязачных атрадаў Маскоўскага ваеннага вокругу.

— „Известия ЦИК" апублікавалі вялікі сьпіс рэзалюцый розных арганізацый, вайсковых часьцей, караблёў і г. д. з патрабаваньнем безадкладнага скліканьня ўсерасейскага зьезду Саветаў для захвату ўлады.

Партыйнае жыцьцё

На суботніку.

У нядзелю раніцой студэнты-камсамольцы Белпэдтэхнікуму і Белпэдкурсаў вывалілі вясёлым роем з сваіх устаноў у савхоз імя Будзёнага на працу.

Да савхозу пяць вёрст.

Роўная дарога, скаваная васеньнім прымаразкам, была ўся засеяна камсамольцамі. А дзень удаўся сухі, сьветлы, прыгожы. На небе ні аднэй хмаркі... Здаецца радасна вітае гэты калектыў, гэтую зьлучаную грамаду, якая робіць вялікую справу. Па дарозе чуцен здаровы сьмех. Даносяцца вясёлыя песьні ад папярэдніх. Жарты запалі нануючае месца і ўсё разам зьліваецца ў адно—радаснае, бадзёрае, магутнае...

Насустрэч едуць сяляне ў горад. Дзівяцца, адкуль іх столькі?

Куды вы валіце, таварышы, гэткай грамадой?—На суботнік, дзядзька, працаваць ідзем,—адказваюць галасы. Мінулі невялічкі лясок. На небасхіле нешта забялела. Гэта палацы аднаго з былых паноў. Цяпер там саўгаспадарка.

Праз некалькі хвілін увесь калектыў пашоў на месца працы.

Вялікі кавалак зямлі, як вокам акінуць, быў засаджаны турнэпсам. Закіпела работа. Адны вырывалі з зямлі буракі. Другія ўсьлед насілі і складалі ў кучы-піраміды. Працавалі заўзята. Пакамсамольску.

— Даёш песьню! уносіцца прапанова. Але якую. Нехта пачынае.

«Нам прыганятых болей ня трэба,

Будзем мы жыць без паноў».

Дружна падхватываецца астатнімі і нясецца песьня ў прасторныя далі, з здаровых камсамольскіх грудзей.

Дзьве гадзіны жвавай працы, і тры дзесяціны саўхозкага турнэпсу былі выкапаны і складзены. Усе зарobленыя грошы пойдуць на карысьць бяспрытульных. Трэба адзначыць вялікую зацікаўленасьць і шчыры ўдзел з боку беспартыйнага студэнцтва, якое было на суботніку.

«Усе на дапамогу бяспрытульным!»—наш сёнешні баявы лёзунг.

А. Кулікоўскі.

Камсамол ваенізуецца.

(Слуцкі раён, Бабруйшчына).

Пасьля летніх камсамольскіх манэўраў праца па ваенізацыі камсамольскіх шэрагаў ня скончылася, а заняла віднае месца ў працы камсамольскіх ячэек. Усе камсамольцы наведваюць гурткі ОСО-Авіяхіму, якія з'арганізаваны амаль пры кожнай партыйнай ячэйцы. У гуртках ёсьць кіраўнікі, якія выдзелены з падшэфных чырвонаармейскіх часьцей. На заняткках гурткоў разбіраюцца: вінтоўка, кулямёт, а таксама праходзяцца тэарэтычныя пытаньні—абарона і наступленьне, газы і інш.

Зацікаўленасьць ваеннай справай ёсьць; аб гэтым сьведчыць шмат пытаньняў, якія задаюцца кіраўніку пасьля сканчэньня той ці іншай гутаркі. Больш усяго цікавяцца пытаньнем аб газах, іх шкадлівасьці і як ад іх пазбавіцца.

Сходы наведваюць і не сябры ОСО-Авіяхіму, якія ў працягу працы знаёмяцца з рознымі пытаньнямі, уступаюць у сябры ОСО-Авіяхіму.

Вясковыя камсамольцы таксама цікавяцца ваенізацыяй. Ставяць платныя вечары і на выручаныя грошы купляюць розныя ваенныя прылады дзеля гурткоў ОСО-Авіяхіму.

Камсамольскія манэўры паслужылі штуршком дзеля далейшай ваенізацыі камсамольцаў і беспартыйнай моладзі.

П. Шт—ў.

Камсамольцы ня сьпяць.

(Вобальскі с.-с., Полаччына).

Усюды ідзе кіпучая праца па падрыхтоўцы да сьвята 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Ня сьпяць і нашы камсамольцы.

Яны, атрымаўшы дырэктывы з рабкому ЛКСМБ, зараз-жа ўзяліся за распрацоўку пляну падрыхтоўкі. Пайшла гарачая праца. З юнацкім захапленьнем прыступаюць да ажыцьцяўленьня вызвачанага пляну.

Дакладчыкі, вылучаныя з больш моцных таварышоў, шчыра рыхтуюцца да дакладаў.

Значную ўвагу зьвярнулі на вёску: там вызвачана пяць пунктаў, на якіх будуць праведзены сялянскія сходы і пастаўлены адпаведныя даклады.

Добра зрабіла ячэйка, што ў працу сваю прыцягнула і настаўнікаў, якім даручыла больш адпаведныя даклады. На вёсках, апроч таго, будуць праведзены культдні моладзі з пастаноўкай дакладаў. Па лініі агітацыйнай ячэйка падрыхтавана добра.

Вось з боку распрацоўкі самага правядзеньня сьвята справа стаіць крыху горш, плян не распрацаваны.

Прычына гэтаму ў тым, што па партыйнай лініі дагэтуль няма кіраўнічых матар'ялаў, і плян яшчэ ня складзен, а вядома, што правядзеньне сьвята павінна быць узгоднена з усімі партыйнымі, савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі.

Трэба шавяліцца, каб сьвята не застала непадрыхтаванымі. **А. М—кі.**

Слуцкія камсамольцы--бяспрытульным.

Восьмага і дзевятага кастрычніка а восьмай гадзіне раніцы выстраіўшысь камсамольцы з лапатамі на плечах і з песьнямі, пайшлі за горад, дзе гарсаветам была прадастаўлена праца па прарыцьцю канаў за плату.

Дружна ўзяліся за працу. Не пасьпеў нас прабраць яшчэ пот, як бачым: стройнымі шэрагамі ідуць на працу камсамольцы - чырвонаармейцы 11-га палка.

Жыва закіпела праца ў чырвонаармейцаў, якія паказалі прыклад, як трэба працаваць. Праца скончана, злапатамі зноў ідзём у горад. Па дарозе дзелімся думкамі аб тым, як прайшоў наш суботнік,—ці ўсё было добра. Не, рашылі, што былі і хібы: ня была ўцягнута ў правядзеньне суботніка беспартыйная моладзь. Ня ўсе камсамольцы зьявіліся на працу. Праўда, былі і такія, якія ў гэтыя дні працавалі ў прадпрыемствах, установах і не маглі ўдзельнічаць у агульнай працы, але тыя камсамольцы павінны адлічыць за гэты дзень сваю пэнсію.

Дзяўчаты таксама ўдзельнічалі ў суботніку.

Да дзесятай гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі слуцкая камсамолія правяла ў жыцьцё пастанову ЦК УсеЛКСМ і паднесла падарунак нашай краіне, які дапаможа зьнішчыць спадчыну мінулага—бяспрытульнасьць.

Ш.

Дасягненьні і недахопы.

(Ячэйка КПБ «Эльвод», Менск).

Расьце ячэйка слабым тэмпам: за апошнія 4 месяцы прынята ў партыю 5 чалавек.

Да гэтага часу ячэйка мае членаў —63 і кандыдатаў—12.

У камсамольскай ячэйцы партыйцы —камсамольцы ня маюць належнага ўплыву, між тым парт'ячэйка ня прымае ў гэтым напрамку ніякіх мер. Грамадзкімі арганізацыямі ячэйка кіруе добра, вынікам чаго зьяўляецца ажыўленая пастаноўка іх працы.

Нарэшце беларусізацыі справа абстаіць кепска. Беларускі гурток партыйцы наведваюць кепска. Цікавы выпадак: калі газэта «Зьвязда» зусім перайшла на беларускую мову, дык партыйцы яе перасталі выпісваць.

Ёсьць і гэткія выпадкі, калі іншыя партыйцы наведваюць сходы і палітзаняткі, а займаюцца ў гэты час зьверхурочнай працай.

Пытаньні апазіцыі ячэйка абмеркавала добра і цалкам далучылася да ўсіх пастаноў вышэйшых органаў нашай партыі. **З.**

Пазыка індустрыялізацыі.

Пазыку--у сельскія мясцовасьці.

З кожным годам крэдытная апэрацыя разьмеркаваньня пазык у Савецкім Саюзе набывае ўсё большае і большае значэньне: удзельная вага сродкаў, якая дае дзяржаўны крэдыт у агульную суму прыбыткаў дзяржаўнага бюджэту, з кожным годам расьце.

Няма неабходнасьці паўтараць даўно вядомую праўду аб тым, якое вялізнае значэньне мае для гаспадарчага будаўніцтва нашае краіны рэалізацыя пазык, як мэтад асыгнаваньня сродкаў, неабходных дзяржаве для паскораньня працэсу індустрыялізацыі краіны.

Што мы можам у нашых умовах зрабіць? Вельмі шмат і што ідэя ўкладу вольных сродкаў у пазыкі глыбока пранікла ў сьвядомасьць усіх пластоў насельніцтва, у асаблівасьці гораду, паказвае апошняе разьмеркаваньне 10-проц. пазыкі 1927 г. Рэалізацыя дала нячуваныя вынікі: у кароткі тэрмін аблігацыі пазыкі былі поўнасьцю разьмяркованы між прыватнымі асобамі, галоўным чынам, між дробнымі трымацелямі-працоўнымі цалкам на ўсе 100 міліёнаў рублёў.

Адным з буйнейшых недахопаў разьмеркаваньня ў нас пазык зьяўляецца тое, што да гэтае пары ўдзельная вага буйных сталічных гарадоў надта вялікая, што мы вельмі мала ўвагі зьвяртаем на прыцягненьне вольных сродкаў у правінцыі, асабліва ў глыбокай сельскай правінцыі. **І зараз наша задача пры разьмеркаваньні пазыкі індустрыялізацыі складаецца з таго, каб цэнтр цяжару перанесьці іменна на правінцыю,** каб прывучыць яе да зьмяшчэньня сваіх вольных сродкаў у дзяржаўных пазыках. Зразумела, задача—нялёгкая, бо кансэрватыўную правінцыю куды цяжэй раскачаць, чымся больш культурнае і лёгкае на ўздым сталічнае насельніцтва; але гэта гаворыць толькі за тое, што трэба ўжыць усе захады, каб яе раскачаць.

Ідэя індустрыялізацыі ўжо так глыбока прасякнула ў сьвядомасьць працоўных мас і так папулярна, што яна сама па сабе дае магчымасьць разгарнуць шырокую кампанію навокал гэтага пытаньня.

А. Львоў.

Як ідзе падпіска на пазыку.

ПРАЦОЎНЫЯ РУБЛЁМ—ПА ЧЭМБЭРЛЕНУ.

Рабочыя абойнай фабрыкі імя Вароўскага лічаць, што лепшым адказам на ўсе прыскі цьвёрдалобых будзе ўдзел у рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі.

— Ён нас нотамі і разрывам, а мы яго —працоўным рублём,—сказаў стары рабочы на сходзе. Рабочыя фабрыкі ўжо здалі падпіску на 2040 руб.

ЧЫРВОНАЯ МІЛІЦЫЯ—РАЗАМ З УСІМІ ПРАЦОЎНЫМІ.

— Чырвоная міліцыя заўсёды ідзе разам з працоўнымі,—сказалі таварышы на агульным сходзе. Сказана—зроблена: калектыў Міліцыі і Крымінальнага Вышуку здаў падпіску на 2000 рублёў.

НЕ АДСТАЮЦЬ І ПРАЦАЎНІКІ БЕЛДЗЯРЖГАНДЛЮ.

Калектыў працаўнікоў Белдзяржгандлю падпісаўся на пазыку індустрыялізацыі на суму 1.895 рублёў

ПАКАЗВАЮЦЬ ПРЫКЛАД.

Партыйцы ня толькі вядуць агітацыю сярод працоўных за ўдзел у рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі, а і самі паказваюць прыклад: калектыў працаўнікоў ЦК КП(б)Б здаў падпіску на 1870 руб.

РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ Ў БАНКАХ.

— На 22 кастрычніка Галоўная Каса Ашчаднасьці рэалізавала пазыкі індустрыялізацыі на 30250 руб. Толькі за апошнія 2 дні прынята падпіска ад розных калектываў на 9000 руб.

— Да 21 кастрычніка ўключна Т-ва Узаемнага Крэдыту рэалізавала пазыкі на суму 53835 руб.

Дзяржбанк да ўчарашняга дня рэалізаваў пазыкі на 48760 руб.: з гэтай сумы па калектыўнай падпісцы—на 13300 руб.

Камунальны банк рэалізаваў на 2975 р. Усекабанк рэалізаваў пазыкі да 21 кастрычніка ўключна на 7000 руб.

Калі адбудуцца розыгрышы выйгрышаў па 3-й сялянскай пазыцы.

Наркамфін СССР устанавіў наступныя тэрміны, у якія адбудуцца розыгрышы выйгрышаў на 3-й сялянскай пазыцы: 2-гі розыгрыш будзе праведзен 15 сакавіка 1928 г., 3-ці—15 верасьня 1928 г., 4-ы—15 сакавіка 1929 г., 5-ы—15 верасьня 1929 г. і 6-ы—15 сакавіка 1930 г.

Першы розыгрыш адбыўся 15 верасьня 1927 г. у станіцы Славянскай, Кубанскай акругі, Паўночна-Каўкаскага краю. Месца розыгрышу для наступных тыражоў будзе ўстанаўляцца Наркамфінам для кожнага тыражу асобна, прычым розыгрыш сялянскай пазыкі будзе праводзіцца, галоўным чынам, у сельскіх мясцовасьцях.

Зьмена--у Чырвоную армію.

(З натуры).

Акуратна ў вызначаны тэрмін прыехалі прызыўнікі з розных куткоў Меншчыны.

Разьбіліся яны па куточках прызыўнога пункту, а пад вечар сабраліся ў вялікім пакоі свайго клюбу. Льлюцца бадзёрыя песьні.

« Мы сьмело в бой пойдем за власть Советов»...—дружна нясецца з грудзей маладых рабочых і сялян.

Учора быў першы дзень, калі зьмена дэмабілізаваным байцам накіроўвалася ў свае часьці. Яшчэ зранку групамі па 5-10 чалавек з разуменьнем адказнасьці моманту ў поўным парадку накіроўваліся на вакзалы.

А 2-ой гадзіне першая буйная адпраўка. Ужо загадзя маладыя чырвонаармейцы сабраліся ў вялікай залі прызыўнога пункту, каб, разьвітаўшыся з прадстаўнікамі менскіх савецкіх, партыйных і прафэсыйных арганізацый, накіравацца ў вайсковую часьць выконваць свой абавязак перад працоўнымі.

Адчыняецца мітынг, правільней кажучы, провады і разьвітаньне з маладымі чырвонаармейцамі.

Тав. Місьнікоў ад імя акругкому партыі і акрвыканкому вітае моладзь.

— Міжнародныя абставіны ўскладаюць на нашую Чырвоную армію найадказнейшыя задачы. Можа, нам хутка прыдзецца намерацца аружжам з ворагам,—кажа ён. — Вы, маладыя чырвонаармейцы, павінны захаваць слаўныя баявыя традыцыі Чырвонай арміі, і мы спадзяемся, што папаўненьне, якое зараз накіроўваецца ў часьці, з посьпехам абароніць заваёвы Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Гучнае, дружнае «ура» ўсёй залі было адказам уладзе і партыі, што новая зьмена выканае ўсе пастаўленыя перад ёю задачы.

Далей зьмену вітаў прадстаўнік ЦСПСБ, які зазначыў, што задача рабочага і селяніна—умацняць сваю прамысловасьць, сваю гаспадарку, мацней трымаць у руках вінтоўку.

Прадстаўнік ЛКСМБ у прывітаньні выказаў упэўненасьць, што камсамольцы і беспартыйная моладзь выканаюць з гонарам надзеі, якія ўскладае на іх рабочы і селянін разам з камуністычнай партыяй.

Зноў дружнае «ура». Мітынг-провады скончаны.

Ідзе пераклічка.

— Ёсьць! Ёсьць! Ёсьць!—пясецца на дзядзінцы прызыўнога пункту. Зьявіліся ўсе, як адзін. Выстрайваюцца ў шэрагі і пад гукі музыкі дружна рухаюцца на вакзал. **В. З—ў.**

Хроніка.

Барацьба з бяспрытульнасьцю.

(У Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры Прэзыдыуме ЦВК БССР).

Барацьба з бяспрытульнасьцю на транспарце.

Да гэтага часу паміж органамі чыгуначнага транспарту БССР ня было шчыльнай сувязі з дзіцячымі арганізацыямі, якія вядуць барацьбу з бяспрытульнасьцю. З гэтай прычыны прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі прызнаў неабходным надалей устанавіць больш цесныя ўзаемаадносіны паміж органамі чыгунак і дзіцячымі камісіямі. Таксама пастаноўлена прасіць упаўнаважанага НК шляхавых зносін даць загад на ўсіх чыгуначных установах БССР, каб упаўнаважаныя дарог і інспэктура асьветы ўвязаліся ў сваёй рабоце з дзіцячымі камісіямі.

Укамплектаваньне ўсебеларускай дзіцячай калёніі.

Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пастанавіў разьмеркаваць 112 месц усебеларускай дзіцячай калёніі наступным чынам: Аршанскай акрузе—15 месц, Бабруйскай—10, Віцебскай—12, Гомельскай—10, Магілеўскай—40, Менскай—25. Астатнія 38 месц застаўлены ў рэзэрве Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі. Укамплектаваньне будзе зроблена дзяцьмі ва ўзросьце ад 10 да 14 год.

10.000 руб. на выпуск пераросткаў дзіцячых дамоў.

Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пастанавіў здаволіць хадайніцтва Наркамасьветы БССР аб водпуску 10.000 руб. на выпуск пераросткаў дзіцячых дамоў. Гэтыя сродкі будуць разьмяркованы: Менскай акрузе—3,700 руб., Віцебскай—1,900 руб., Магілеўскай і Бабруйскай па—1,400 р., Аршанскай—800 руб., Полацкай—500 руб. і НКАсьветы—300 руб.

Мерапрыёмствы НК РСІ на 1927-28 год.

На апошнім пасяджэньні ЦКК-РСІ разглядала пляп працы, якую мае правесьці ў 1927-28 г.

Гэты плян абхоплівае ўсе галіны будаўніцтва нашай рэспублікі. Пры складаньні пляну прымаліся пад увагу дырэктывы цэнтральных органаў, партыі і праца мінулага году.

Нашы асноўныя задачы, як зьніжэньне будаўнічага індэксу на 15 проц., скарачэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў на 20 проц., сабекошт прамысловай прадукцыі, найбольшае скарыстаньне ашчаднасьці насельніцтва на дапамогу дзяржаве, —усе гэтыя задачы ўвайшлі ў плян.

Адносна паляпшэньня дзяржаўнага апарату плян прадугледжвае далейшае вывучаньне яго ў сэнсе рацыяналізацыі устаноў і іх спрашчэньня, барацьба з бюракратызмам, кумаўством і валакітай. Але ўсе гэтыя мерапрыёмствы будуць мець посьпех, калі прыдзе на дапамогу РСІ актыўнасьць мас.

Што датычыцца прамысловасьці, то акрамя капітальнага будаўніцтва (Асінастрой, Бабруйскі камбінат і інш.), у пляне высоўваюцца яшчэ заданьні, як: дрэваапрацовачная прамысловасьць, будаўніцтва с.-г. машын і г. д.

Вось асноўныя моманты ў працы НК РСІ на 1927-28 г.

ЯК РАЗЬМЯРКОВАНЫ МАЛАДЫЯ ЎРАЧЫ.

З 163 дактароў, якія ў гэтым месяцы скончылі мэдфак БДУ, 140 чалавек зараз жа накіроўваюцца на працу. Рэшта ж па некаторых прычынах застаецца пад загадам Нар. Кам. Аховы Здароўя.

З прызначаных на працу на самастойныя лябараторныя пункты накіроўваецца 47 асоб, у раённыя больніцы—11, на пасаду санітарных дактароў—3 ч., 40 чал. будзе платна стажыравацца па розных галінах працы ў лекавых установах Менску. Рэшта маладых урачоў будзе прызначана на працу па прафілактычнай галіне.

ІНТЭРНАТ ДЛЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ.

Менскі Гарсавет асыгнаваў 10.000 руб. на пабудову інтэрнату для беспрацоўных. Аддзел камунальнай гаспадаркі адпусьціў для гэтай мэты будынак, які ў хуткім часе будзе перавезен у Менск. Пабудоўка інтэрнату закончыцца вясной наступнага году.

1.220.000 руб. на каналізацыю Менску.

На каналізацыю ў Менску на 1927-28 г. мяркуецца затраціць 1-250.000 руб. У лік гэтай сумы будзе атрымана: па доўгатэрміновым крэдыце 750 тысяч. рублёў, з мясцовага бюджэту—250 тысяч, са сродкаў па грамадзкія працы—50 тысяч і астатак крэдыту мінулага году ў суме 170 тысяч р.

АБСТАЛЯВАНЬНЕ ДЛЯ ВІЦЕБСКАЙ ІЛЬНА-ПРАДНАЙ ФАБРЫКІ.

На днях атрыманы з Нямеччыны для Віцебскай ільна-праднай фабрыкі 5 магутных ватар-машын. Акрамя гэтага, зроблен яшчэ заказ на 4 ватар-машыны.

Бібліятэчкі для с.-гасп. каапэрацыі.

Белсельбанк набыў бібліятэчкі па пытаньнях сельска-гаспагарчага крэдыту. Гэтыя бібліятэчкі будуць дасланы ва ўсе с.-г. таварыствы.

Кіно-перасоўка для рабочых.

ЦП саюзу будаўнікоў закупіла кіно-перасоўку для абслугоўваньня рабочых будаўнікоў раёнаў Менскай акругі.

10.000 руб. на с.-гасп. машыны.

Белсельбанк выдаў Цэнтраземскладу 10 тысяч руб. на набыцьцё сельска гаспадарчых машын і прыладаў.

Віцебская акулярная фабрыка будзе працаваць без перапынку.

Для Віцебскай акулярнай фабрыкі на днях атрымана з Нямеччыны вялікая партыя аптычнага шкла, дзякуючы чаму фабрыка зможа працаваць без перапынку.

Падрыхтоўка да Кастрычніка.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ РЫХТУЕ ПАДАРУНКІ ДА 10-га КАСТРЫЧНІКА.

— Беларуская Вайсковая Школа рыхтуе каманду лепшых стралкоў з маладых і старых курсантаў і чырвонаармейцаў.

— К сьвяту чырвонаармейцы № батальёну пабудавалі цір. Гэты цір ужо абнавілі —курсанты-выпуснікі, наладзіўшы ў ім спаборніцтвы. Найбольшае дасягненьне—93 ачкі са 100. К сьвяту даб'ёмся павышэньня якасьці стральбы.

— 5 поля дае вёсцы к сьвяту 80 камсамольцаў-актывістаў. Зараз гэтыя камсамольцы-адпускнікі ўзмоцнена рыхтуюцца да працы ў вёсцы.

— Начсклад №-га складу і №-ай роты М.С.В. арганізавалі 1 і 14 кастрычніка суботнік: разгрузілі за два разы 6 вагонаў, за што атрымалі 100 руб. Гэтыя грошы ўносім у якасьці падарунка да Кастрычніка ў фонд „Наш адказ Чэмбэрлэну".

ДАСЯГНЕНЬНІ ЖЫЛКААПЭРАЦЫІ ДА 10-га КАСТРЫЧНІКА.

Колькі пабудована дамоў.

Жылкаапэрацыя за мінулыя гады пабудавала дамоў: у Гомелі—133, у Віцебску—31, у Бабруйску—24, у Барысаве—14 і ў Мазыры - 8 дамоў.

Колькі будзе пабудована дамоў у бяг. годзе.

Сёлета жылкаапэрацыя к 1 студзеня 1928 году закончыць пабудоўку новых дамоў: у Гомелі—85, у Віцебску—21, у Бабруйску—15, у Барысаве—21 і ў Мазыры—4 дамы.

Хроніка падрыхтоўкі да Кастрычніка.

Выпуск бюлетэня Мопр'у.

Да кастрычнікавых урачыстасьцяў Цэнтральны Камітэт Мопр'у Беларусі выпускае спэцыяльны бюлетэнь, прысьвечаны 5-цігодзьдзю Мопр'у на Беларусі і 10-й гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Адчыненьне нардому і вэтэр. лячэбніцы.

У м. Смалявічы, Менскай акругі, у дні сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычніка адчыняецца новы нардом і вэтэрынарная лячэбніца. Акрамя гэтага, адбудзецца закладка пляпавай 2-хкамплектнай польскай школы і перадача 2-му яўрэйскаму меліярацыйнаму т-ву 150 гэктараў балотнай зямлі для асушкі.

Новыя броварныя і крахмальныя заводы.

Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі адчыняецца 5 броварных заводаў у савецкіх гаспадарках: „Косіва" (Меншчына), „Пагост" і „Фогінь" (Бабруйшчына), Межава" (Аршаншчына) і „Добрынь" (Мазыршчына) і 2 крахмальныя заводы ў сав. гаспадарках „Весялова-Крычына" (Меншчына) і „Дойнічава" (Бабруйшчына).

ПАСТАНОВЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі

аб складаньні плянаў замежных камандыровак.

У разьвіцьцё пастановы СНК СССР за 9 мая 1927 году „Аб рэгуляваньні замежных камандыровак" (З. З. СССР 1927 г., № 24, арт. 265) Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Абавязаць Народныя Камісарыяты штогод складаць пляны патрэбных для іх і падпарадкаваных ім устаноў і прадпрыемстваў замежных камандыровак і не пазьней як за месяц да паданьня бюджэту ў Народны Камісарыят Грашовых Спраў падаваць гэтыя пляны на зацьверджаньне Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры Савеце Народных Камісараў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Мароз.**

3 кастрычніка 1927 году.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР

о составлении планов заграничных командировок.

В развитие постановления СНК СССР от 9 мая 1927 года „О регулировании заграничных командировок" (С. З. СССР 1927 г., № 24, ст. 265), Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

Обязать Народные Комиссариаты ежегодно составлять планы необходимых для них и для подведомственных им учреждений и предприятий заграничных командировок и не позже, чем за месяц до представления бюджета в Народный Комиссариат Финансов представлять эти планы на утверждение Государственной Плановой Комиссии при Совете Народных Комиссаров БССР.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **И. Голодед.**

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **М. Мороз.**

3 октября 1927 г.
г. Минск.

СУД.

Хто зрабіў злачынства?

(Да забойства тав. Апанскага).

ПРАМОВА ПРАКУРОРА ТАВ. ГАРТ.

Учарашняе пасяджэньне суду распачалося прамовай пракурора тав. Гарт.

— Хто зрабіў злачынства: асоба, якая выконвала службовыя абавязкі, ці прыватная асоба, да якой нельга прыстасаваць артыкул 107 Крым. Кодэксу.

Каб даць адказ на гэтыя запытаньні, трэба аднавіць у памяці акалічнасьці справы.

Што д-р Львовіч ня выканаў чалавечага абавязку,—кажа тав. Гарт,—гэта зусім зразумела, бо звычайны неадукаваны селянін Драневіч і то схапіў вядро з вадою і пабег на месца здарэньня, каб дапамагчы. Д-р Львовіч гэтага не зрабіў, ня гледзячы на тое, што яго паведамілі аб няшчасьці,—яго прасілі дапамагчы пакалечаным. Я разглядаю гэта злачынства, як злачынства па службе, ці прасьцей—службовае злачынства. Доктар Львовіч быў на пасадзе, яму было даручана даглядаць, з мэдычнага боку, гэлы раён, і ён за гэта адказвае. Ён адказвае так, як адказваў-бы нават адпачываючы ў доме адпачынку інжэнэр, якому данесьлі, што ён можа адратаваць ад узрыву мост, і ён не адратаваў. Львовіч павінен адказваць яшчэ больш, бо інжэнэр адпачываў, а Львовіч ні на хвіліну не пераставаў быць доктарам для дому адпачынку.

А што зрабіў Львовіч? Ён пачаў расхаджваць па плятформе, павёў сваю жонку да хаты, бо як ён, д-р Львовіч, можа ў такі крытычны момант пакінуць без дагляду сваю жонку? Пасьля ён хаваўся ад дажджу, а ратавалі пакалечаных ня ішоў.

У справе няма нічога, што магло-б зьмягчыць віну д-ра Львовіча, бо д-р Шапіра з Менску прыехаў на месца здарэньня, даў магчымую дапамогу, а Львовіч ня мог гэтага зрабіць, будучы там, на месцы. Гэтак мог зрабіць ня доктар, які займае савецкую пасаду, а дробны і нікчэмны мешчанін, які хацеў, каб у гэты «страшны» момант (ён думаў, што з боку польскай мяжы зараз пачуе выстралы) пры ім на адным ложку былі і жонка і дзеці.

Ставячы доктара на той ці іншы пост, савецкая ўлада і грамадзкасьць спадзяюцца, што за гэты пост яны спакойны. Д-р Львовіч паказаў якраз адваротнае. Будучы на пасту, ён ня зьдзейсьніў тых надзей, якія на яго ўскладаліся; а таму ён павінен адказваць, як службовая асоба, па 107 арт. з карнай санкцыяй па 1 частцы 105 арт.

ПРАМОВА ПРАВААБАРОНЦА ТАВ. КОРСАКА.

Праваабаронец тав. Корсак дакладна спыніўся на псыхалёгічным аналізе злачынства. Ён адзначыў, што Львовіч праслужыў 6 год у Чырвонай арміі, дзе яго нэрвовая сыстэма падарвалася, і, дзякуючы гэтаму Львовіч ня мог даць правільнага напрамку сваім дзеяньням, атрымаўшы паведамленьне аб катастрофе.

Далей абаронца зазначае, што злачынства трэба кваліфікаваць па 1 часьці 165 арт. Крым. Кодэксу, бо ў гэтым выпадку нельга дапусьціць, што Львовіч быў пры выкананьні службовых абавязкаў. Яго службовыя абавязкі, па думцы тав. Корсака,—дакторства ў доме адпачынку і ўсё. Што робіцца па-за домам—не датычыцца Львовіча, як доктара.

* * *

У часе рэплік пракурор і праваабаронец абмяняліся думкамі, якія надаюць дакладнасьць іх пасобным разуменьням.

Суд вышаў на нараду.

Прыгавар па справе доктара Львовіча.

Суд прызнаў д-ра Львовіча вінаватым у злачынстве, прадугледжаным другой частцай 165 арт. Крым. Кодэксу і прыгаварыў яго на 1 год зьняволеньня.

С. Азерскі.

У трэці раз.

(Да суду над Чысьцяковым і К-о).

24 кастрычніка назначана для слуханьньня справа былога загадчыка Менскага аддзяленьня продасілікату і яго блізкіх прыяцеляў—Шастакова і Кішмана.

Справа гэта ўжо слухалася два разы, але і ў першы і другі раз суд знайшоў магчымым па хадайніцтву абароны, у асобе абаронцы члена калегіі т. Крэйнеса, адкласьці справу.

І сапраўды, ці варта столькі думаць аб якіхсьці там рабкорах, ці варта ладзіць суды, і мы ня ўпэўнены, што абарона і ў трэці раз ня знойдзе якіянебудзь аргумэнты для адкладаньня справы.

Абарона разумна дзейнічае: адкладзём два разы, адкладзём, калі трэба будзе, і ў трэці раз, і тады гэта справа сама па сабе страціць сваю вострасьць і цікавасьць.

Шкада, калі наша грамадзкасьць будзе прыслухоўвацца да такіх салодкіх слоў абаронцаў, вельмі шкада.

Нядаўна на старонках «Праўды» быў зьмешчаны вельмі цікавы артыкул (№ 236 ад 15-X) т. Д. Е. аб рабкорах.

Аўтар падкрэсьлівае, што ў апошні час назіраюцца частыя выпадкі тайнага прасьледваньня рабкораў, па тых ці іншых прычынах рабсельнкоры адхіляюцца ад працы, іх прасьледваюць і ўсякімі законнымі і незаконнымі спосабамі іх абыходзяць. У гэткіх выпадках аўтар дамагаецца паказальнага суду.

І мы таксама настойваем на паказальным судзе над Чысьцяковым і К-о, мы патрабуем шырока абвясьціць, інакш розныя гаспадарнікі, накшталт тыпу Чысьцякова, бязьлітасна будуць таптаць рабкораў і сьценкораў. Факт маецца такі: наступнік Чысьцякова т. Субач бадай яшчэ больш пастараўся, чым яго папярэднік, вельмі „ласкава, лагодна" гаварыў з двума сьценкорамі Продасілікату т. т. Гарэлікам і Рапапортам, ён «згаджаўся» з імі аб неабходнасьці ўзварушыць грамадзкую думку, аб вялікай ролі рабкораў, а праз дзень-другі таксама ласкава і лагодна выкінуў з пасады Гарэліка і Рапапорта, пакінуўшы на пасадзе тых, што знаходзяцца пад судом.

Трэба пакласьці гэтаму канец, трэба, каб суд сказаў сваё аўтарытэтнае слова, бо інакш прасьледваньні ня спыняцца і гэткія Субачы будуць зьдзекавацца над рабкорамі і сьценкорамі.

Суд над Чысьцяковым і К-о павінен быць паказальным.

Рабкор.

Усесаюзны шахматна-шашачны зьезд.

(Ад уласнага карэспандэнта).

Засталося ўсяго тры дні гульні ў шахматным чэмпіянаце, а барацьба за першынства не ваціхае: у лепшых шансах—Рамаоўскі, тут-жа—Дуз-Хацімірскі і Багатырчук. З маладых ужо заваявалі званьне майстра Модэль, Макагонаў і Бацьвіньнік; ёсьць шансы быць майстрам у Грыгор'ева; астатнія змагаюцца за пачэснае месца.

У шашачным чэмпіянаце прымае ўдзел 21 ігрок; барацьба вельмі ўпартая. На першых месцах пакуль што Сакалоў +8 з палов. з 11, далей—малады Бакуменка + 9 з 12, Кукуеў + 8 з палов. з 12, Патапаў + 8 з 11, Берак, Сідлін і Гінзбург + 8 з 12, Мядкоў, былы чэмпіён, толькі 7 з палов. з 12. Прадстаўнікі Беларусі Гардоны І. і С. іграюць на 50 проц.

Камандныя спаборніцтвы прафсаюзаў.

У турніры прымаюць удзел 17 прафсаюзаў; разыграна палова турніру. На першых месцах: саўгандльслужачыя, харчавікі і рабпрос + 30 з палов. з 9, далей—металісты + 27 з палов. з 8, будаўнікі + 25 з 8, гэтыя пяць саюзаў будуць змагацца за першынства; далей—хімікі + 23 з 9, тэкстыльшчыкі + 21 з 8, чыгуначнікі + 21 з палов. з 8, друкары + 19 з палов., гарнякі + 19, мэдсанпрацы + 7 з палов., сельгаспрацаўнікі + 16 з палов., камунальнікі + 16 і г. д.

Наогул, усе шахматна-шашачныя спаборніцтвы цягнуцца месяц з удзелам звыш 200 ігракоў.

Масква.

Апавяшчэньні.

АПА Менскага АК КП(б)Б паведамляе, што ў сераду, 26 кастрычніка, а 9 гадз. увечары ў цэнтральным габінэце агітацыйна-прапагандысцкай працы (клюб імя К. Маркса) адбудзецца ГРУПАВАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ ТАВ. ЛУР'Е на тэму: „ЯК ВЫВУЧАЦЬ ПАЛІТЭКАНОМІЮ (МЭТАДЫЧНАЕ І МЭТАДАЛЁГІЧНАЕ ВЯДЗЕНЬНЕ".

Запрашаюцца прапагандысты партыйнай і камсамольскай палітсеткі, т. т., якія займаюцца ў гуртках палітэканоміі, індывідуалы і жадаючыя вывучыць палітэканомію.

— У пятніцу, 28 кастрычніка, а 7 гадз. увечары ў цэнтральным габінэце агітацыйна-прапагандысцкай працы (клюб імя К. Маркса) адбудзецца КАНСУЛЬТАЦЫЯ ТАВ. ПАНКЕВІЧА на тэму: „УТАМЛЯЕМАСЬЦЬ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАНЬНЯ".

Запрашаюцца прапагандысты партыйнай і камсамольскай палітсеткі, выкладчыкі 7-хгодак—партыйцы і кансультанты прапагандысты па самаадукацыі.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА**

ФІЗКУЛЬТУРА.

Вечар фізкультуры.

31 кастрычніка бюро фізкультуры пры ЦСПСБ наладжвае вечар фізкультуры. Прафсаюзныя гурткі рыхтуюць спэцыяльныя ўласныя прафэсыйныя піраміды; напр., гурток саюзу друкароў пакажа піраміду „Друкарскі станок", які выпусьціць фізкультурныя лістоўкі—лёзунгі, гурток харчавікоў рыхтуе піраміду „Булачнік", іншыя гурткі таксама дадуць выступленьне з прафэсыйным ухілам.

Да зімовага сэзону.

ВСФКБ у працягу зімы будуць праведзены ўсебеларускія спаборніцтвы па цяжкой атлетыцы, лыжавым і каньковым спорце.

На ўсіх акругах адбудуцца міжгурткоўныя і акруговыя спаборніцтвы па гэтых галінах спорту.

Чакаецца ўдзел заграніцных рабочых каманд.

КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА»	„ЧЕЛОВЕК из РЕСТОРАНА". Драма ў 8-х частках.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	ГРАНДЫЁЗНАЯ ПАСТАНОЎКА „СМАРАГДА НАБУРЭН". У гал. ролі выдатн. нямецкая артыстка ЭЛЬЛЕН РЫХТЭР.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	Каласальная мастацка-гістарычная фільма „ДЕКАБРИСТЫ". Пачатак 1-га сэансу ў 7 гадз. веч.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Пашпарт, Рабіновіч М. Р.-Ш.,—выд. Менакрміліц., кв. № 49.

— Асабова-вайсковы білет, Берасьневіча С. М.,—выд. М. вакрваенкамат., кв. № 50.

— Сяброўская кніжка № 5757, Берасьневіча С. М.,—выд. саюзам Саўгандльслуж., кв. № 51.

— Конская кніжка № 2752, Яўхімчыка Ц. В.,—выд. Гроскім РВК, кв. № 52.

— Сяброўскі білет № 6142, Немцава Ц. А.,—выд. саюзам саўгандльс., кв. № 53.

— Студэнцкае пасьведчаньне № 5-466, Немцава Ц. А.—выд. БДУ, кв. 54.

— Пасьведчаньне аб нараджэньні ў 1905 годзе Шабуні І. Б., выд. Смалявіцкім РВК, кв. 43

Галоўліт ск. 28204

1-я Дзяржаўная друкарня.